ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА Н.Т.У.-В.С.Н.Х. Инв. №

Інтэрвэнты рыхтаваліся затапіць СССР у крыві рабочых

і абярнуць Савецкі Саюз у калёнію міжнароднага капіталу

АБ ГЭТЫМ МАРЫЛІ ПУАНКАРЭ-ВАЙНА І РАБУШЫНСКІЯ, ГЭТА РЫХТАВАЛІ РАМЗІНЫ І ЛАРЫЧАВЫ

Раздушыць гадзіну контр-рэвалюцыі!

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 281 (3879)
АЎТОРАК, 2 сьнежня 1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем пасьвяточных

Перавыбарчая кампанія—праверка клясавай баяздольнасьці саветаў

Учора па БССР пачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў.

Перавыбары адбываюцца ў надзвычай складаных і абвостраных міжнародных абставінах. Разьдзіраны глыбачэзнымі супярэчнасьцямі ўсеагульнага крызісу міжнародны капіталізм працуе разьвязваць іх шляхам контр-рэвалюцыйнай захватніцкай вайны супроць СССР.

Працэс здраднікаў з «прампартыі» — агентаў інтэрвэнцыі, які зараз адбываецца, наглядна пераконвае працоўныя масы нашага Саюзу і ўсяго сьвету, якім чынам імпэрыялістыя, на чале з пануючай хэўрай Францыі і яе генэральным штабам, падрыхтоўвалі антысавецкую інтэрвэнцыю—зрыў індустрыялізацыі краіны, пяцігадовага пляну, калектывізацыі. Працэс выяўляе, як падрыў тварыўся задушэньне працоўнае «насьцістай рукой голаду», крывавая рэстаўрацыя капіталізму, зьвяржэньне савецкай улады і пэртваранье СССР ў калёнію міжнароднага капіталу.

Ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, рашучае правядзеньне палітыкі ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі—выклікае шалёнае супраціўленьне паміраючых клясаў нашай краіны і іх агентаў—у форме шкодніцтва, барацьбы кулацтва супроць калгасаў, сабатажу і ажыўленьня варожых савецкай уладзе элемэнтаў у дзяржаўным і каапэрацыйным апараце. Унутры партыі гэта супраціўленьне клясавага ворага знаходзіць адбітак у барацьбе супроць генэральнай лініі партыі з боку апартуністых усіх масьцей—ад правых і «левых» да двурушнікаў і здраднікаў з права-«лявацкага» блёку—усе яны на справе дапамагаюць клясаваму ворагу.

Выкрытая органамі ДПУ Беларусі інтэлігенцкая група контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных агентаў інтэрвэнтаў з першых дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі, у шчыльным саюзе з вялікадзяржаўнай расійскай контр-рэвалюцыяй з нямецкімі ды польскімі акупантамі, вялі збройнае змаганьне супроць пралетарскай дыктатуры, супроць СССР.

У адказ на спробы інтэрвэнтаў рабочыя і працоўныя масы БССР, як і ўсяго Саюзу, мабілізуюць усе сілы на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны Саветаў, на ўзмацненьне магутнасьці Чырвонай арміі, яшчэ больш разгортваюць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва для пасьпяховага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, пасылаюць лепшых рабочых-ударнікаў у партыю, праводзяць дадатковую падпіску на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» для ўзмацненьня фінансавай базы сацыялістычнага наступленьня, арганізуюць новы прыліў у калгасы, чырвоныя абозы і г. д.

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА БЫЦЬ УЗЯЗАНА З БАРАЦЬБОЙ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ЎСІХ ЗАДАНЬНЯЎ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД ПАРТЫЯЙ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І САВЕЦКАЙ УЛАДАЙ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ. АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ ПАТРЭБНА АДДАЦЬ СПРАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ І АСКОЎНЫХ МАС СЯЛЯНСТВА НАВАКОЛ ПЫТАНЬНЯЎ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ І ПРАВЕРКІ РАБОТЫ САВЕТАЎ У ГЭТЫМ АБСЯГУ.

У справаздачах саветаў неабходна падагуліць вынікі вялізарных посьпехаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, якія дасягнуты ў рэзультаце актыўнай дапамогі СССР. Перавыбарчая кампанія павінна быць вагаром у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу, за ажыцьцяўленьне пастановы Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б аб калектывізацыі да 1 студзеня 1931 г. да 20 процантаў сялянскіх гаспадарак БССР, за далейшае разгортваньне культурнага будаўніцтва — нацыянальнага па форме пралетарскага па зьмесьце.

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПАВІННЫ ПРАЙСЬЦІ НА АСНОВЕ РАЗГОРНУТАЙ САМАКРЫТЫКІ і выкрыць усе слабыя месцы ў нашай рабоце. Бальшавікі ніколі не страдалі масавазнаю і з усёй бязьлітаснасьцю ўскрывалі як труднасьці нашага росту, так і недахопы і памылкі ў рабоце. Рашучае правядзеньне самакрытыкі дапамагае мабілізацыі мас на перамаганьне труднасьцяй і зьнішчэньне недахопаў. Але траба пільна сачыць, каб пад выглядам самакрытыкі не дапускаць варожай нам крытыкі клясаварожых элемэнтаў і іх агентаў унутры партыі — правых і «левых» апартуністых, права-«лявацкага» блёку і нацыянал-апартуністых.

УСЯ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА БЫЦЬ ШЧЫЛЬНА УВЯЗАНА З ВЫРАШЭНЬНЕМ ВАЖНЕЙШЫХ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ КАМПАНІЙ, ЯНА ПАВІННА ЎЗМАЦНІЦЬ РАЁННАЕ ЗЬВЯНО САВЕЦКАЙ СЫСТЭМЫ. ПАД КУТОМ ПОГЛЯДУ ВЫКАНАНЬНЯ САВЕЦКІМІ ОРГАНАМІ ГЭТЫХ КАМПАНІЙ ТРЭБА АЦЭНЬВАЦЬ УСЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ САВЕТАЎ. Трэба даць рашучы адпор усякім апартуністычным спробам і разважаньням наконт «чарговасьці кампаній». Толькі той, хто дзейнічае ў мэтах клясавага ворага, можа адрываць выбарчую кампанію ад іншых задач, якія вырашае зараз партыя і рабочая кляса. Дабіцца 100-процантнага выкананьня баявых заданьняў па ільне, збожжы і бульбе, па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, па выкананьні якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну і іншых гаспадарча-палітычных кампаній, гэта азначае правільна правесьціць справаздачна-перавыбарчую кампанію.

Перавыбары саветаў — гэта МАСАВАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КАМПАНІЯ. У яе ўцягваюцца сапраўды мільённыя масы. Задача партыйных, камсамольскіх, прафсыянальных і савецкіх арганізацый — дабіцца 100-процантнага ўцягненьня ўсіх мас выбаршчыкаў у перавыбары. ПРЫ ГЭТЫМ АСАБЛІВА ВАЖНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ МАЕ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЎДЗЕЛУ Ў КАМПАНІІ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН — РАБОТНІЦ, КАЛГАСЬНІЦ, БАТРАЧАК, БЯДНЯЧАК І СЕРАДНЯЧАК, А ТАКСАМА ПРАЦОЎНЫХ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ, якіх у першую чаргу папрабуе выкарыстаць клясавы вораг.

Весткі, якія паступаюць з вёскі, сыгналізуюць ужо аб розных спробах кулацтва скарыстаць у сваіх клясавых мэтах усе найбольш слабыя вучасткі нашай работы, аб спробах нашага клясавага ворага пры дапамозе зьвярынага тэрору супроць сельскіх актывістых і хітрасьці пралезьці ў нізавыя зьвяны пралетарскай дыктатуры, каб іх з сярэдзіны падрываць.

ТОЛЬКІ ЦЬВЁРДАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ КІРАЎНІЦТВА З БОКУ ПАРТОРГАНАЎ І ЯЧЭЕК ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІЯЙ МОЖА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АРГАНІЗАВАНЫ АДПОР РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС УСІМ ВЫЛАЗКАМ КЛЯСАВАГА БОРАГА. Гэта набывае тым большае значэньне таму, што РАД ЦЭНТРАЛЬНЫХ І МЯСЦОВЫХ УСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА, А ДАВОЛІ ЧАСТА І ЗУСІМ СЛАБА, ПАДРЫСТАВАЛІСЯ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ. Адсюль задача — НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНЫ ЧАС, ПЕРАБУДАВАЦЦА НА-ХАДУ. У гэтым павінны адыграць вялікую ролю рабочыя брыгады, якія выяжджаюць у вёску для дапамогі ў перавыбарах сельсаветаў.

Справаздачна-перавыбарчыя сходы павінны быць праведзены пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за далейшае разгортваньне індустрыялізацыі і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, пад знакам абвастраньня нашага наступленьня на капіталістычныя элемэнты, за ліквідацыю кулацтва, як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, пад знакам бязьлітаснага адпору правым і «левым» апартуністым і іх рознавіднасьці — нацыянал-апартуністым, пад знакам моцнага ўдару па фракцыянэрах з права-«лявацкага» блёку і прымірэнцах да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. На перавыбарчых сходах трэба выкрыць усякія спробы атакаваць лінію партыі з боку вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, найбольш небясьпечнага на даным этапе, і контр-рэвалюцыйных нац.-дэмакратаў і шавіністых іншых колераў.

Выключна важнай задачай перавыбараў зьяўляецца значнае ўмацаваньне саветаў клясава вытрыманымі кадрамі, здольнымі па-бальшавіцку кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам. У выніку перавыбараў саветы павінны яшчэ больш павярнуцца тварам да задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Перавыбары саветаў зьявяцца яшчэ адной вялізарнейшай дэманстрацыяй згуртаванасьці рабочых, калгасных, бядняцка-сераднякіх і ўсіх працоўных мас вакол ленінскай палітыкі нашай камуністычнай партыі на чале з яе Цэнтральным Камітэтам.

Пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б)

аб фракцыйнай рабоце Сырцова, Ламінадзэ і іншых

1. Заслухаўшы паведамленьне Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі аб фракцыйнай антыпартыйнай рабоце Сырцова, Шацкіна і іншых і тлумачэньні апошніх, ЦК і ЦКК устанаўляюць, што:

а) тав. Сырцоў арганізаваў падпольную антыпартыйную групу, у кіруючае ядро якое ўваходзілі Нусінаў, Каўрайскі, Гальпэрын, Курс і іншыя;

б) тав. Ламінадзэ стаяў на чале існаваўшай на працягу значнага часу фракцыйнай антыпартыйнай групы, у кіруючае ядро якое ўваходзілі Шацкін, Разьнік і іншыя;

в) гэтыя фракцыйныя падпольныя групы арганізавалі «лева»-правы блёк на аснове агульнай палітычнай пляцформы, супадаючай ва ўсім асноўным з пляцформай правых апартуністых;

г) гэта пляцформа, навеяная панікай перад труднасьцямі і жаданьнем паспекуляваць на іх, патрабуе, па сутнасьці справы, адмовы ад бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва і абвяшчае неабходнасьць «звужэньня фронту капітальнага будаўніцтва» (Ламінадзэ);

д) для апраўданьня сваёй апартуністычнай пляцформы т.т. Сырцоў, Ламінадзэ і іншыя ўжывалі такія чыста меншавіцкія, груба-паклёпніцкія прыёмы барацьбы з партыйным і савецкім кіраўніцтвам, як абвяшчэньне посьпехаў нашага будаўніцтва «очковтирательством» (Сырцоў), абвяшчэньне Сталінградзкага трактарнага заводу «Пацёмкінскай вёскай» (Сырцоў), сьцьвярджэньне аб тым, што ў савецкім апараце Закаўказьня «пануюць панска-фэадальныя адносіны да патраб і інтарэсаў рабочых і сялян» (Ламінадзэ) і г. д.;

е) абедзьве групы дапускалі ў сваёй фракцыйнай рабоце расканспіраваньне сакрэтных пастаноў партыі;

ж) тав. Сырцоў, як і тав. Ламінадзэ і Шацкін праводзілі ў сваіх адносінах да партыйнага кіраўніцтва двурушніцтва і ашуканства партыі, а пры апытаньні ў ЦКК давалі заведама няправільныя паказаньні.

2. ЦК і ЦКК устанаўляюць далей, што тым самым т.т. Сырцоў, Ламінадзэ, Шацкін і іншыя парушылі:

а) пастанову X зьезду партыі аб адзінстве, а іменна:

«каб ажыцьцявіць суровую дысцыпліну ўнутры партыі і дабіцца найбольшага адзінства пры адхіленьні ўсякай фракцыйнасьці, зьезд дае ЦК паўнамоцтвы ўжываць у выпадках парушэньня дысцыпліны ці пярэчаньня або дапушчэньня фракцыйнасьці ўсе меры партыйных спагнаньняў аж да выключэньня з партыі, а ў адносінах да членаў ЦК — перавод іх у кандыдаты і нават, як крайнюю меру, выключэньне з партыі».

б) пастанову аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК у красавіку 1929 г., а іменна:

«устанавіць спэцыяльныя меры, аж да выключэньня з ЦК і з партыі, якія могуць гарантаваць [illegible] пастаноў ЦК і Палітбюро»;

в) пастанову XV зьезду партыі, а іменна:

«члены партыі, якія адмаўляюцца праўдзіва адказваць на запытаньні кантрольных камісій, падлягаюць неадкладнаму выключэньню з партыі».

3. На падставе ўсіх гэтых фактаў ЦК і ЦКК пастанаўляюць:

а) т.т. СЫРЦОВА і ЛАМІНАДЗЭ ВЫКЛЮЧЫЦЬ СА СКЛАДУ ЦК УсеКП(б).

б) тав. ШАЦКІНА ВЫКЛЮЧЫЦЬ СА СКЛАДУ ЦКК УсеКП(б).

Справа селькоркі т. Мясьніковай

Знаёмячыся са справай селькоркі Мясьніковай, адразу паўстае пытаньне, як магло здарыцца, што прымаўная актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце селькорка тав. Мясьнікова на працягу доўгага часу зьяўлялася мішэньню абуджаючага зьдзеку, прасьледваньня і цкаваньня з боку групы межынскіх адказных работнікаў. У чым заключаюцца прычыны, што ў раённым цэнтры, на вачох партыйнага кіраўніцтва, гадамі цягнулася гэта агідная справа, што скаргі тав. Мясьніковай у райком партыі заставаліся «гласом вопиющего»?

На гэта пытаньне даецца выразны адказ у пастанове парткалегіі ЦКК, «што справа тав. Мясьніковай магла ўзьнікнуць толькі дзякуючы таму, што ў межынскай раённай партарганізацыі на працягу доўгага часу ня выконвалася адна з важнейшых дырэктыў партыі аб разгортваньні пралетарскай самакрытыкі.

Раённае парткіраўніцтва, праяўляючы апартуністычныя адносіны да паказаных зьявішч, ня здолела выправіць дапушчаных памылак і прарываў у справе разгортваньня самакрытыкі, не вяло рашучай барацьбы з зажымшчыкамі самакрытыкі».

За тое, што тав. Мясьнікова выкрывала праз друк недахопы ў рабоце партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый, а таксама паасобных работнікаў, якія разлажыліся, зрасьліся з кулацкімі элемэнтамі, межынскія глупышцелі самакрытыкі арганізавалі супроць яе паход-цкаваньне, ужываючы розныя агідныя мэтады кампрамэтацыі. Былы сакратар рудзянскай ячэйкі Якушэнка, зьяўляючыся адначасова і старшынёй райпрафбюро, разам з прафработнікам Атрашкевічам усякімі мерамі перашкаджалі ўступіць тав. Мясьнікоўай у члены саюзу, прымушалі яе да сужыцьця з імі і за адмаўленьне распаўсюджвалі хлусьлівыя чуткі аб яе палавой распусьце, награжалі зьняць з работы і г. д.

На гэтым зьдзеку з Мясьніковай не канчаюцца. Элемэнты, якія маральна разлажыліся: будучы вельмі абурацымі крытыкай з боку тав. Мясьніковай, не пакідалі цкаваньня, пры ўсякім выпадку пахабна паклёпнічалі, што яна разбэшчаны элемэнт, самагоншчыца, эксплёататарша і інш. Нарэшце, справа даходзіць да таго, што Атрашкевіч дае выдуманыя матар'ялы кампрамэтуючага характару Зільбэргу, які па фіктыўным мандаце праходзіць на раённую канфэрэнцыю саюзу нархарч і скарыстоўвае сваё выступленьне выключна для паклёпу на тав. Мясьнікову. Апрача пакаяных асоб, у цкаваньні і кампрамэтацыі Мясьніковай прымалі ўдзел Клявін, Купцоў, Гімпельсон і Аблавецкі.

Замест рашучага ўдару па глушыцелях самакрытыкі і злачынным цкаваньні селькоркі, замест мабілізацыі партыйных мас на разгортваньне самакрытыкі, як дзейснай зброі ў змаганьні супроць бюракратызму, недахопаў у рабоце і розных нездаровых зьявішч, партыйнае кіраўніцтва Межынскага раёну фактычна змазвала справу.

Бюро райкому ў бытнасьць сакратара РК тав. Карапёва, грунтуючыся на беспадстаўных чутках аб кепскіх паводзінах Мясьніковай, не падтрымала яе ў барацьбе са злачыннымі элемэнтамі, адмовіла ёй ў прыёме ў партыю, што выкарыстала ў сваёй дзейнасьці група зажымшчыкаў самакрытыкі і элемэнтаў, якія маральна разлажыліся.

Апошні склад бюро РК таксама не праявіў бальшавіцкай рашучасьці ў справе рэагаваньня на абураючыя факты зацiску самакрытыкі і разлажэньня руднянскай ячэйкі, а абмежаваўся толькі выключэньнем з партыі сакратара ячэйкі Якушэнка, які фактычна да апошняга часу зьяўляўся членам ячэйкі і заставаўся на кіруючай прафсаюзнай рабоце. Вылучаныя для абсьледваньня становішча руднянскай ячэйкі партыйцы Муляўка і Кавалёў ня выканалі пастановы бюро РК. Т. ч. Міхайлаў і Сухамлінаў, якім было даручана тэрмінова расьсьледваць справу аб прасьледваньні Мясьніковай, «марынавалі» гэту справу на працягу паўтара месяца. Бюро РК, у прыватнасьці намесьнік сакратара тав. Камянецкі, не сачыла за ажыцьцяўленьнем сваёй пастановы па гэтым пытаньні.

Вынікі вельмі сумныя. Селькорка Мясьнікова стала ахвярай групы межынскіх глушыцеляй самакрытыкі і злачынных элемэнтаў, якія абюракраціліся і маральна разлажыліся. Тав. Мясьнікова—дайшла да вар'яцтва.

Парткалегія ЦКК, дэталёва выяўіўшы гэту справу, жорстка ўдарыла па межынскім гнойніку. Якушэнка, Клявін і Капцэвіч выключаны з партыі. Камянецкаму абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем і ён выведзены са складу бюро РК. Зільбэргу і Купцову абвешчана суровая вымова, апошняму забаронена займаць адказныя пасады на працягу двух год. Конюхаву—суровая вымова і ён выведзен са складу бюро РК. Карапёву, Якаўлеву (былыя сакратары РК), Міхайлаву, Сухамлінаву, Муляўка, Кавалёву і Гімпэльсону абвешчаны вымовы. Таксама абвешчана вымова ўсяму цяперашняму складу бюро межынскага РК КП(б)Б за выключэньнем тав. Сапрыцкага, які фактычна ня меў ніякіх адносін да справы т. Мясьніковай.

Парткалегія даручыла пракурору рэспублікі ў двухдэкадны тэрмін расьсьледваць справу селькоркі Мясьніковай і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці, правёўшы грамадзка-паказальны суд над глушыцелямі самакрытыкі. Запрапанавана межынскаму РК прыняць рашучыя захады ў справе разгортваньня самакрытыкі ва ўсёй раённай партарганізацыі і ўзьняцьця на належную вышыню работы з селькорамі

Ів.

ПРАЦЭС „ПРАМПАРТЫІ"

„Торгпром" і інтэрвэнцыя

Суд пераходзіць да разгляду пытаньняў, зьвязаных з дзейнасьцю «Торгпрома» і да высьвятленьня ўзаемаадносін «Торгпрома» з «прампартыяй». Вычарпальныя даныя па ўсіх гэтых момантах суда паведамляе падсудны Рамзін.

Упяршыню аб існаваньні сувязі кіруючых інжынэрных колаў з «Торгпромам» Рамзін даведаўся з двух крыніц: ад Пальчынскага і Хрэньнікава і адначасова ад Фядотава і Лапацінна. Гэта было ў пачатку 1927 году пасьля ўступленьня Рамзіна ў інжынэры цэнтр. Тады яму стала вядома, што Пальчынскі падтрымлівае сувязь з Мяшчэрскім і Рабушынскім, Федарэвіч—з Уркварта, а Рабіновіч—з Дварчанчыкам (Польшча).

Сам Рамзін непасрэдна зьвязаўся з прадстаўніком «Торгпрома»—Рабушынскім у 1927 годзе ў часе сваёй паездкі ў Парыж. Дырэктывы зьвязацца з Рабушынскім Рамзін перад ад'ездам у заграничную камандыроўку атрымаў ад Пальчынскага і Хрэньнікава.

Спатканьне Рамзіна з Рабушынскім, паводле меркаваньняў кансьпірацыйнага характару, адбылося ў аўтамабілі. Гутарка цягнулася паўтары гадзіны і датычыла асноўных пытаньняў палітычнай і эканамічнай праграмы і пытаньняў, зьвязаных з арганізацыяй інтэрвэнцыі. У часе тэй-жа гутаркі Рамзін атрымаў дырэктыўныя указаньні наконт далейшых дзеяньняў інжынэрнага цэнтру.

Рамзін зноў катэгарычна пацьвярджае, што ў асабістай гутарцы даведаўся ад Рабушынскага аб тым, што вядзецца падрыхтоўка да інтэрвэнцыі. «Торгпром», як перадаў Рабушынскі, вядзе наконт гэтага непасрэдныя перагаворы з францускім урадам, карыстаючыся ўплывам і падтрыманьнем Лушэра. Справа пасунулася настолькі ўперад, што ўжо ў бліжэйшы час, як запэўняў Рабушынскі, можна будзе гаварыць аб канкрэтных формах удзелу ў інтэрвэнцыі Францыі, Англіі і інш. краін. Сярод членаў «Торгпрома» пытаньне аб неабходнасьці і мэтазгоднасьці інтэрвэнцыі не выклікала ніякіх сумненьняў. На тэй-жа пазыцыі сталі кіруючыя францускія колы. Між імі былі разыходжаньні толькі наконт найбольш рацыянальнага тэрміну будучай інтэрвэнцыі. У «Торгпроме» схіляліся да думкі аб пажаданасьці адцярпуць некалькі тэрмін інтэрвэнцыі да моманту больш значнага адчуваньня прамысловых прадпрыемстваў савецкай уладай. Францускія ўрэдавыя колы наадварот, напіралі на неабходнасьць фарсаваньня інтэрвэнцыі, бо з кожным годам узмацнялася абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Першапачаткова тэрмін інтэрвэнцыі прыстасоўваўся да 1928 году. Рамзін атрымаў ад Рабушынскага дырэктыву ўсямерна фарсаваць падрыхтоўку да яе ўнутры краіны. Гэта падрыхтоўка павінна была забясьпечыць пасьпяховую арганізацыю інтэрвэнцыі звонку. Заданьне «Торгпрома» зводзілася наогул да таго, што інжынэрны цэнтр абавязан усе свае намаганьні накіраваць на ўзбуджэньне нездавальненьне савецкай уладай у шырокіх масах насельніцтва і настаўленьне эканамічных затрудненьняў у мэтах забесьпячэньня інтэрвэнцыі. На тым-жа спатканьні з Рабушынскім было канчаткова вырашана пытаньне аб устанаўленьні пастаяннай сувязі інжынэрнага цэнтру з «Торгпромам». Рабушыскі назваў пры гэтым Рамзіну прозьвішча аднаго з агентаў францускай службы ў Маскве К., як асобу, якая будзе служыць зьвязваючым зьвяном паміж інжынэрным цэнтрам і «Торгпромом».

Падсудны Калініньнікаў у сваю чаргу са слоў Хрэньнікава, з якім ён яшчэ да звароту Рамзіна з-заграніцы гутарыў па тую-ж тэму, цалкам пацьвярджае правільнасьць паведамленьня Рамзіна. Гэта паведамленьне ва ўсіх дэталях супадае з тым, што ён ведаў аб інтэрвэнцыі праз Хрэньнікава. Тэрмін інтэрвэнцыі Хрэньнікаў таксама адносіў да 1928 году.

Другі падсудны Фядотаў па тым-жа пытаньні сьведчыць:

— Да 1927 году я да ўсіх гутарак аб інтэрвэнцыі адносіўся з вышыні, лічачы іх хвальбою. Потым для мяне стала ясным, што ініцыятыва ў пытаньнях інтэрвэнцыі перайшла да францускіх колаў і што да гэтай падзеі трэба сур'ёзна рыхтавацца. У 1928 г. «Торгпром» ужо знаходзіўся ў непасрэдных зносінах з кіруючымі коламі Францыі, і францускі генэральны штаб непасрэдна пачаў распрацоўваць праграму інтэрвэнцыі. Для гэтага генштаб меў усе падставы, бо ўжо да пачатку 1928 году перагаворы паміж «Торгпромом» і Пуанкарэ і Брыянам былі канчаткова афармлены.

Рамзін пры далейшым допыце ўказаў, што ён меў магчымасьць пераканацца ва ўсім гэтым пры паўторным спатканьні з кіраўнікамі «Торгпрома», якое адбылося паміж 5-12 кастрычніка 1928 году, калі ён праездам з Лёндану, дзе прымаў удзел у сусьветнай апалавай канфэрэнцыі, зноў наведаў Парыж.

На нарадзе ў «Торгпроме» Рамзіну і Ларычаву, які знаходзіўся разам з ім, было паведамлена, што Пуанкарэ і Брыян парашылі арганізаваць інтэрвэнцыю і што пры францускім генэральным штабе створана пад старшынством генэрала Жанэна спэцыяльная камісія распрацоўкі дэталяй яе правядзеньня.

Па хадайніцтве пракуратуры суд пастанавіў далучыць да справы нумар белагвардзейскай газэты «Возрождение» (ад 7 ліпеня бягучага году), у якім зьмешчан артыкул Рабушынскага з заклікам да «справядлівай вайны» супроць Савецкага Саюзу.

У гэтым артыкуле гаворыцца, між іншым:

Ёсьць войны бессансоўныя, шкодныя, разбуравчыя і ёсьць войны карысныя, разумныя, «созидательные». Да апошняй «розанавідзьці» войнаў Рабушынскі адносіць і вайну супроць СССР.

«Як зьнішчыць бальшавіцкую балячку», задумваецца Рабушынскі і тут-жа адказвае:

«У 1920-25 гадох спэцыялістыя браліся ажыцьцявіць такую апэрацыю з арміяй у 1 млн. чалавек...» «зараз мэханізм савецкай улады вельмі расхістаўся... магчыма 500 тысяч чалавек і 3-4 месяцаў будзе даволі...» (сьмех у залі).

«Няма ў сьвеце прадпрыемства, якое было-б больш рэнтабэльным, чым вызваленьне Расіі»,—піша гэты камэрсант-палітык.

«Затрацім адзін мільярд рублёў, чалавецтва атрымае прыбытак ня менш, чым у 5 мільярдаў рублёў, г. зн. 500 процантаў гадавых з пэрспэктывай узрастаньня прыбытку кожны год яшчэ на 100-200 процантаў»—захлынаючыся, усклікае Рабушынскі. (Агульны сьмех). Тав. Вышынскі абвяшчае перапынак.

На далейшым пасяджэньні высьвятляюцца некаторыя падрабязнасьці, якія адносяцца да генэрала Жанэна.

Потым суд пераходзіць да допыту падсуднага Ларычава, які расказвае падрабязнасьці аб нарадзе яго і Рамзіна з «торгпромавцамі», якая адбылася ў Парыжы ў кастрычніку 1928 году.

У адказ арганізатарам інтэрвэнцыі яшчэ больш павысім тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, шчыльней згуртуемся вакол Ленінскага ЦК УсеКП(б)

Хваля абурэньня супроць шкоднікаў і інтэрвэнтаў міжнароднага імпэрыялізму ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй, захопліваючы ўсе пласты працоўнага насельніцтва БССР. З усіх нават самых аддаленых куткоў Савецкай Беларусі кожны дзень паступаюць пратэсты з патрабаваньнем вышэйшай меры пакараньня для шкоднікаў і ўзнагароды вернага вартавога Кастрычніцкіх заваёў — АДПУ ордэнам Леніна. У сваіх рэзалюцыях працоўныя масы БССР на шкодніцтва адказваюць дадатковай падпіскай на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады», масавым уступленьнем у рады Асоавіяхіму, у ворам сродкаў у фонд абароны краіны, замацаваньнем сябе на сваіх прадпрыемствах да канца пяцігодкі.

Так, рабочая брыгада ў ліну 6-ці чалавек заводу «Полымя рэвалюцыі» адлічвае паўдзенны заработак на пабудову дырыжабля «Зьнішчыцель контр-рэвалюцыі» і выклікае пасьледваць іх прыкладу ўсіх рабочых ня толькі свайго заводу, але і рабочых БССР.

— Асьветнікі пры Мсьціслаўскім пэдтэхнікуме ў адказ шкоднікам і інтэрвэнтам ўносяць 90 руб. у фонд абароны краіны і дадаткова падпісваюцца на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на 1.400 руб.

Калектыў асьветнікаў выклікае на спаборніцтва на дадатковай падпіскі на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» асьветнікаў раёну і ўсе пэдтэхнікумы БССР.

— Сход каапэрацыйна-прамысловых арцеляй і саматужнікаў Талачыншчыны дадаткова падпісваецца на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на 312 рублёў і ўсе, як адзін, уступаюць у рады Асоавіяхіму.

— Чачэрская раённая канфэрэнцыя цігодка — за чатыры гады» на 1.000 рублёў і арганізуе ячэйку Асоавіяхіму, у якую запісваюцца на ўсе 100 проц.

Працоўныя абвяшчаюць сябе ўдарнікамі па выкананьні і перавыкананьні плянавых заданьняў пяцігодкі.

— Рабочыя і служачыя станцыі Талочын МББ чыг. патрабуюць ад Вярхоўнага суда для ўсіх удзельнікаў «прампартыі» расстрэлу.

Чыгуначнікі падпісваюцца на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на 312 рублёў і ўсе, як адзін, уступаюць у рады Асоавіяхіму.

— Чачэрская раённая канфэрэнцыя калгасьнікаў патрабуе ад пралетарскай дзяржавы расстрэлу шкоднікаў з «прампартыі» — гэтых агентаў францускага імпэрыялізму, якія сваёй работай падрыхтоўвалі інтэрвэнцыю імпэрыялістых супроць СССР.

У адказ на выкрытае шкодніцтва калгасьнікі Чачэрскага раёну абавязваюцца яшчэ больш разгарнуць работу па масавай калектывізацыі, па пашырэньні існуючых і арганізацыі новых калгасаў, здачу дзяржаве ўсіх сваіх лішкаў.

Акрамя таго, рэзалюцыі пратэсту паступілі ад каманды аднагодніку №-скага стрэлковага Чырвонасьцяжнага палка імя Валадарскага, ад рабочых гуты імя Домбаля, ад агульнага сходу работнікаў Белрадыёцэнтру, ад рабочых і служачых саўгасу Прылукі, ад агульнага сходу работнікаў і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу лесааб'яднаньня «Лесбел» інш.

НА ПРАЦЭСЕ «ПРАМПАРТЫІ». У ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯ СУДУ.

З ЗАЛІ СУДА

ТВАР ЛЁКАЯЎ

Пралетарскі суд ужо шосты дзень крапатліва і настойліва разматвае клубок жудасных злачынстваў, сетку змоў і інтрыг, што называецца справай «прампартыі». Цяпер ужо ўсяму сьвету ясна, што гэта — справа ня толькі злачынай зграі вучоных здраднікаў і шпіёнаў, усяму сьвету ясна, што на лаўцы падсудных у Калённай залі сядзяць побач з Рамзіным падпальшчыкі з францускага генштабу з іх высокім апякуном Пуанкарэ-Вайной.

І, ня гледзячы на тое, або, вярней, дзякуючы таму, што гэта стала ясна нават для палітычных сьляпцоў, цікавасьць да працэсу ня толькі не аслабляецца, але ўсё больш разгараецца. Калённая заля ўжо не зьмяшчае ўсіх жадаючых набываць на судзе, і тыя, што засталіся на той бок залі, натоўпам стаяць каля рэпрадуктараў у фае. На лаўках чужаземных журналістых стала яшчэ гусьцей і цясьней. Пралетарыяты буржуазнага друку ўсяго сьвету прагна чакаюць якога-небудзь зрыву, якога-небудзь правалу ў агульнай канцэпцыі абвінавачвага заключэньня — дарэмна. Кожная новая пэталь, кожны новы штрых, унесены чарговым паказаньнем, пацьвярджае і дапаўняе матар'ялы папярэдняга сьледзтва, дарысоўвае агульны малюнак, даны ў абвінавачэньні — ва ўсіх яго часьцях, ва ўсіх яго разьдзелах, па ўсіх яго пунктах.

Асаблівасьць гэтага працэсу ў тым, што ўсе падсудныя безагаворачна і поўнасьцю прызналі сваю віну. Стаўшы на гэты шлях поўнага прызнаньня з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі, падсудныя на першым этапе працэсу, карыстаючыся свабодай выказваньня на судзе і тым, што яны нікім не перарываюцца і ня спыняюцца, прабавалі надаць сваім тлумачэньнем характар «лекцый» і «дакладаў». Няхай гэта будуць сваяасаблівыя «лекцыі» аб шкодніцтве, няхай гэта будуць дрэнна пахнучыя «даклады» аб шпіянажы і здрадніцтве — падсудныя яшчэ маглі захоўваць сваю «прафэсарскую» і проста чалавечую годнасьць.

Але як зьмяніўся малюнак, калі працэс уступіў у другі этап, — калі суд прыступіў да высьвятленьня палітычнай фізіяноміі кожнага з абвінавачаных, калі суд закрануў асабістае жыцьцё кожнага з іх. Куды дзеўся гэты незалежны «прафэсарскі» выгляд, куды дзелася гэта акругленая, літаратурна адточаная мова, куды дзелася гэта прытворнае пакаяньне?..

Толькі сапраўдныя палітычныя дзеячы здольны на судзе даваць простыя і яс

Контр-рэвалюцыянэры---нацыянал-дэмакраты імкнуліся абярнуць Савецкую Беларусь у калёнію польскага імпэрыялізму

Абураны пралетарыят БССР патрабуе бязьлітаснай кары для агентаў польскага фашызму--Ластоўскіх, Лёсікаў, Цьвікевічаў, Смолічаў і К°

Рабочыя і інжынэры „Энэргіі“ вітаюць ДПУ Беларусі,

патрабуючы вышэйшай меры пакараньня для контр-рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай групы

Агульны сход рабочых, інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу заводу «Энэргія» выказвае шчырую надзяку АДПУ Беларусі за выкрыцьцё беларускай контр-рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай групы.

Рабочыя заводу «Энэргія» патрабуюць ужыцьця вышэйшай меры сацыяльнай абароны для членаў гэтай контр-рэвалюцыйнай групы, якія змагаліся супроць дыктатуры пралетарыяту на Беларусі.

Абяцаем яшчэ больш намагчы свае сілы для выкананьня задач асобнага ўдарнага кварталу і трэцяга гру пігодкі.

СУРОВА ПАКАРАЦЬ агентаў польскага фашызму

Мы вітаем баявы орган пралетарскай дыктатуры — ДПУ Беларусі, які своячасова выкрыў контр-рэвалюцыйную дзейнасьць разьюнанага беларускага шавінізму — контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

Кожнаму рабочаму, кожнаму працоўнаму Савецкай Беларусі сёньня ясна, што беларускі нацыянал-дэмакратызм у сваіх здрадніцкіх плянах меў на мэце ідэю буржуазнай рэстаўрацыі краіны, быў агентурай беларускага нацыянал-фашызму, а таксама зьяўляўся саюзьнікам і агентам польскага фашызму і польскага імпэрыялізму.

Ставячы перад сабою такія контр-рэвалюцыйныя мэты, беларускія нацыянал-дэмакраты ня спыняліся ні перад чым, каб сваю ідэю як найхутчэй ажыцьцявіць. Былыя маршалкі, прэм'еры і міністры контр-рэвалюцыйнай, гэтак званай «беларускай найвышэйшай рады», падхалімы і наймíты французкага, польскага і чэхаславацкага капіталу, карыстаючыся пэўным давер'ем рабочай клясы і савецкага грамадзтва БССР, пралазілі ва ўсе шчыліны магутнага сацыялістычнага будаўніцтва і там вялі сваю контр-рэвалюцыйную справу. У барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту і кіраўніцтва камуністычнай партыі яны скарыстоўвалі самыя здрадніцкія мэтады, самыя агідныя сродкі.

Час ад часу беларускім нацыянал-дэмакратам удавалася і адкрыта ўзьнімаць свой контр-рэвалюцыйны голас, рабіць свае контр-рэвалюцыйныя выдазкі, як на фронце эканамічным, так і асабліва на фронце культурным. Мы маем на ўвазе справу Наркамзему, калі засеўшыя там беларускія нацыянал-дэмакраты ў тэорыі і на практыцы бралі яскравы курс на кулацкую гаспадарку, на разьвіцьцё капіталістычных элемэнтаў вёскі і супроцьпастаўлялі сваю палітыку палітыцы камуністычнае партыі і савецкай улады, вялі барацьбу супроць сацыялістычнага сэктара сельскае гаспадаркі. Таксама і ў Наркамасьвеце, разам з былым наркомам Баліцкім, беларускія нацыянал-дэмакраты праводзілі сваю нацдэмаўскую палітыку, зрываючы справу падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў на культурным фронце, камплектуючы школы, асабліва ВНУ і ВТНУ, элемэнтамі, варожымі савецкай уладзе і дыктатуры пралетарыяту. Беларускія нац-дэмы авялі свае гнёзды і праводзілі контр-рэвалюцыйную працу ў БАН, Навукова-Дасьледчым Інстытуце, Белдзяржвыдавецтве і інш.

Нац-дэмаўская агентура працавала і ў пісьменьніцкіх арганізацыях. Не абышлося без контр-рэвалюцыйных вылазак паасобных пісьменьнікаў і ў літаратурнай арганізацыі «Полымя». Аб гэтых яўна нацыянал-дэмакратычных выступленьнях яскрава сьведчыць выкрытая партыйнай і савецкай грамадзкасьцю контр-рэвалюцыйная сутнасьць «ліста трох пісьменьнікаў» аб выхадзе з БДУ, контр-рэвалюцыйны верш А. Дудара (тады-ж выключанага з «Полымя»), узьнятая Т. Глыбоцкім (Дударом) і падтрыманая Ц. Гартным і Зарэцкім тэатральная дыскусія, яўна нацыянал-дэмакратычныя творы М. Зарэцкага «Падарожжа на новую зямлю», раман «Крычы».

Ц. Гартны прызнаў свае палітычныя памылкі. Ён прааналізаваў сваю творчасьць, свае публіцыстычныя артыкулы і перад шырокай савецкай грамадзкасьцю заявіў аб іх шкодлівасьці. Зараз ён і ў прыватнай рабоце, над кіраўніцтвам партколектыву заводу «Камунар», імкнецца іх выправіць. Прызнае свае памылкі і М. Зарэцкі. Але арганізацыя «Полымя» патрабуе ад М. Зарэцкага яшчэ больш рашучага, без усякіх хістаньняў выкрыцьцё гэтых памылкі перад рабочай клясай і савецкай грамадзкасьцю. Ц. Гартны і М. Зарэцкі прызналі і прызнаюць зараз, што іх такога роду літаратурная прадукцыя зьяўлялася зброяй клясавага ворага, ворага савецкай улады і дыктатуры пралетарыяту, яны прызнаюць, што сваімі гэтымі творамі аб'ектыўна дапамагалі разгортваць дзейнасьць і ўмацняць свае пазыцыі беларускаму контр-рэвалюцыйнаму нацыянал-дэмакратызму.

Арганізацыя «Полымя» не пазбаўлена была над-дэмаўскай агентуры, якая хавала свой агідны твар, праводзячы здрадніцкую працу і гэтым самым накладаючы чорную пляму на ўсю арганізацыю. Нараўні са сваімі нац-дэмаўскімі правадырамі яны павінны адказваць перад пралетарыятам і працоўнымі. Ня месца агентам і падпявалам нац-дэмаўшчыны ў радах пісьменьніцкіх арганізацый. Віна арганізацыі «Полымя» ў тым, што яна своячасова не змагла выкрыць гэтых здраднікаў, гэтых «былых» людзей з цёмным мінулым, якія зашыліся ў рады пісьменьнікаў і творылі свае цёмныя справы.

У далейшай сваёй працы арганізацыя «Полымя» будзе пільна сачыць за чысьтатою сваіх радоў ад клясавых ворагаў і за тым, каб творчая прадукцыя кожнага члена арганізацыі служыла моцным аружжам у клясавай барацьбе з ворагамі дыктатуры пралетарыяту.

Шырокі ўдзел рабочай клясы ў культурным будаўніцтве і літаратурным жыцьці краіны, пралетарская крытыка і самакрытыка літаратурнай прадукцыі, папаўненьне пісьменьніцкіх радоў пралетарскай праслойкай — рабочымі пісьменьнікамі ад фабрык і заводаў, ад калгасаў і саўгасаў, — вось неадкладная задача, якая стаіць перад кожнай літаратурнай арганізацыяй і перад усёй беларускай пралетарскай літаратурай.

Арганізацыя «Полымя» патрабуе самага суровага пакараньня контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія вялі барацьбу супроць пралетарскай дзяржавы, супроць дыктатуры пралетарыяту і вялікіх кастрычніцкіх заваёў рабочае клясы, узмацняючы гэтым самым фронт міжнародных капіталістых і інтэрвэнтаў супроць Савецкага Саюзу.

Мы патрабуем, каб кожны працаўнік, кожны навуковы работнік, кожны культурнік, у тым ліку і пісьменьнік, раз назаўсёды і канчаткова выявіў свае адносіны да дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнага будаўніцтва і не на словах, а на справе даведаў, што ён з усёй сваёй адданасьцю і энтузіязмам, разам з пралетарыятам, будуе сацыялістычную дзяржаву і вядзе ўпартую барацьбу з ворагамі сацыялізму.

Рашучы агонь па ўсіх відах ухілістых, прымірэнцах і так званых апалітычных элемэнтах, якія па сутнасьці дапамагаюць справе контр-рэвалюцыі.

Мы, падпісваючы суровае асуджэньне контр-рэвалюцыйнай групе беларускіх нацыянал-дэмакратаў, патрабуючы жорсткага пакараньня ўдзельнікаў контр-рэвалюцыі, з усёй сваёй шчырасьцю і адданасьцю запэўняем камуністычную партыю, савецкую ўладу і ўсю пралетарскую грамадзкасьць, што будзем весьці бязьлітасную барацьбу з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам, з праявамі якога-б там ні было колеру нацыянал-апартунізму, з рознымі ўхілістымі, з усімі элемэнтамі, варожымі да пралетарскай дыктатуры і заваёў Вялікага Кастрычніка.

Усе свае сілы, усю сваю здольнасьць і энтузіязм мы аддаем і аддамо ў сваёй савецкай грамадзкай працы і на фронце разьвіцьця пралетарскай літаратуры толькі рабочай клясе і яе кіраўніку — ленінскай камуністычнай партыі ў справе пасьпяховай пабудовы сацыялізму.

Мы заўжды гатовы ў апошнюю і рашучую бойку з ворагамі рабочае клясы і дыктатуры пралетарыяту, за канчатковую перамогу сацыялізму.

Бязьлітасная кара беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратам — саюзьнікам інтэрвэнтаў.

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Няхай жыве ленінская камуністычная партыя!

Сябры аб'яднаньня беларускіх пісьменьнікаў «Полымя» — М. ЧАРОТ, Ц. ГАРТНЫ (З. ЖЫЛУНОВІЧ), НЁМАНСКІ, М. ЗАРЭЦКІ, А. ВОЛЬНЫ, В. СТАШЭЎСКІ, ГАЛУБОК.

Ніякім

Шкодніцкім сілам не зламаць волі рабочае клясы да будаўніцтва сацыялізму

Голас рабочых заводу „Полымя Рэвалюцыі“

Рабочыя заводу «Полымя Рэвалюцыі», заслухаўшы паведамленьне аб выкрыцьці і арышце контр-рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай групы ў БССР, заяўляюць, што **ніякім шкодніцкім сілам не зламаць волі рабочае клясы да будаўніцтва сацыялізму.**

Расьце гэта воля, расьце сіла і магутнасьць рабочае клясы, будуецца новае жыцьцё на сацыялістычных пачатках.

Усё больш востра адчуваюць нашы ворагі поступ сацыялізму, усё бліжэй і бліжэй чуюць яны сваю пагібель. Вось чаму яны арганізуюць шкодніцтва і шпіянаж, вось чаму яны выконваюць заданьні французкага генштабу і Пуанкарэ - Вайна.

Але нас не зламаць. Мы нюхалі порах і не баімся яго.

Наш адказ агентам польскага фашызму — беларускім контр-рэвалюцыянэрам — барацьба за перавыкананьне пяцігодкі, за ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны.

Палкае прывітаньне зоркаму вартавому Кастрычніцкіх заваёў — ДПУ Беларусі.

Наша гарачае прывітаньне вартавому савецкіх межаў — Чырвонай арміі.

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва — УсеКП(б)!

Няма літасьці

натхніцелям крывавага бандыта Булак-Балаховіча

Канфэрэнцыя ўдарнікаў ВНУ Кастрычніцкага раёну выказвае абурэньне супроць выкрытай контр-рэвалюцыйнай беларускай нацыянал-дэмакратычнай групы, якая імкнулася скарыстаць даручаную ёй адказную работу ў галіне культурнай, навуковай і гаспадарчай на шкоду пралетарыяту, на шкоду культурнага ўзьдыму працоўных мас Беларусі, падрыхтоўваючы побач са здрадзікамі з «прампартыі» і іншымі глебу для імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі.

Канфэрэнцыя упэўнена, што ніякім сілам шкодніцкаў, контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў ня спыніць магутнага ўзьдыму энэргіі працоўных Савецкага Саюзу на шляху нерамоўнай барацьбы за сацыялізм, на шляху стварэньня новых форм грамадзкае працы — магутнага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Канфэрэнцыя патрабуе бязьлітаснага пакараньня шкоднікаў, нацыянал-дэмакратаў — гэтых натхніцелаў крывавага бандыта Булак-Балаховіча. Канфэрэнцыя заклікае ўсіх ударнікаў ВНУ шчыльней згуртаваць свае рады вакол ленінскай партыі і яе ЦК для далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва.

ПРЭЧ БЕЛАРУСКІХ ПРЫХВАСЬНЯУ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ!

Былыя правадыры Грамады—Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсэвіч выкрываюць манэўры пілсудчыны

Датэрміновае вызваленьне б. паслоў Грамады--панскія штучкі для абаламучаньня беларускіх працоўных мас

Дэклярацыя Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і Бурсэвіча

Мы сёньня друкуем дэклярацыю былых паслоў у польскі сойм правадыроў Грамады **Рак-Міхайлоўскага, Мятлы** і аднаго з актыўных працаўнікоў Грамады—**Бурсэвіча**. Усе яны прасядзелі ў турме па 3½ гады і ў дэклярацыі выкрываюць манэўры фашысцкіх акупантаў.

Дэклярацыя была зьмешчана ў замежным друку.

Да рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі Заходняй Беларусі

ТАВАРЫШЫ!

Барацьба працы з капіталам, барацьба працоўных мас з буржуазіяй заваструецца чым далей, тым больш. Палітычны і гаспадарчы крызіс, які цяпер перажываюць дзяржавы Зўропы і ўсяго сьвету, няўхільна вядзе працоўныя масы да перамогі над прагнілым буржуазным ладам. Беспрацоўе ўсюды расьце, калёніяльныя і падняволеныя народы рэвалюцыйнай барацьбой настойліва дамагаюцца права на вольнае існаваньне. Для сьвядомых сваіх заданьняў працоўных мас усяго сьвету, а таксама для падняволеных і калёніяльных народаў, існаваньне на 1/6 частцы зямнога кулі ўлады рабочых і сялян прыдае сілы працоўным у іх барацьбе з буржуазіяй і іх акупантамі. Імпэрыялістым і буржуазіі хацелася-б задушыць СССР, але боязна ім рынуцца на Саветы, каб ня выклікаць гэтым рэвалюцыі з боку працоўных мас у сваіх краёх. Аднак-жа імпэрыялістыя не расстаюцца з думкай аб паходзе супроць СССР, падтрымліваючы паспухмяную ім панскую Польшчу ў яе імпэрыялістычных імкненьнях на Ўсход.

Гаспадарчы крызіс у самой Польшчы павялічваецца. Беспрацоўе расьце, непасільныя падаткоўы цяжар даводзіць да роспачы сялянскія масы як беларускія і украінскія, так і польскія. Палітычны крызіс у Польшчы ўсё больш паглыбляецца. Пачынаючы з маю 1930 г., фашысцкая дыктатура Пілсудзкага робіцца ўсё больш адкрытай і жорсткай. «Строньніцтва хлопскае», «Вызваленьне», ППС і Пяст вядуць нібыта змаганьне з гэтай дыктатурай Пілсудзкага, але сапраўды — гэта толькі хатняя сварка, гэта толькі сварка за тое, каму бліжэй сталць да дзяржаўнага карыта. Заклікі гэтых дробна-буржуазных і мяшчанскіх партый да змаганьня з фашызмам толькі картакмі пры выбарах у сойм, зьяўляюцца чарговым абаламучваньнем сялянства і рабочых. Праўдзівы сялянска-рабочы ўрад можа ўтварыцца толькі ў рэзультаце рашучага рэвалюцыйнага змаганьня працоўных мас як з фашысцкай дыктатурай Пілсудзкага, так і з усімі згодніцкімі партыямі.

ТАВАРЫШЫ! Заходняя Беларусь, у выніку вайны захваченая панскай Польшчай, ужо дзесяць год топчацца ботам акупанта. Акупацкая ўлада стараецца КАТАВАНЬНЕМ АРЫШТАВАНЫХ І ТУРМАМІ СПЫНІЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЎЗДЫМ ЗАХОДНЯ - БЕЛАРУСКІХ ПРАЦОЎНЫХ МАС. Аднак, гэта акупанцка-буржуазнай уладзе не ўдаецца. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух расьце і паглыбляецца. Імкненьне працоўных мас Зах. Беларусі да вызваленьня з-пад памешчыцка-буржуазнай польскай улады давяло ў свой час да стварэньня магутнай масавай арганізацыі Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, якая аб'ядная ў сваіх радох каля 120 тысяч сьвядомых беларускіх сялян і работнікаў. Арышт паслоў Грамады і цэлых тысяч грамадаўцаў, нарэшце, закрыцьцё Грамады — гэта знак слабасьці польска-буржуазнага ладу, гэта страх перад ростам рэвалюцыйнага руху. Грамаду зачынілі, паслоў і правадыроў яе пасадзілі на доўгія гады за турэмныя краты, але рэвалюцыйна-вызваленчы рух ніхто ліквідаваць ня здолеў і ня здолее.

Заўчаснае звальненьне пасьля трох з паловай гадоў катаргі трох паслоў і некаторых дзеячоў Грамады, утварэньне двух-трох дзесяткаў польска-беларускіх пачатковых школ — вось яны панскія штучкі ДЛЯ АБАЛАМУЧАНЬНЯ І ДЭЗАРЫЕНТАВАНЬНЯ МАС. Але пра гэтыя хітрыя манэўры польска-панскай палітыкі працоўныя масы добра ўжо ведаюць. Падачкамі фашысцкага ўраду нарыстаецца толькі беларускія буржуазія і кулацтва, на ПРАЦОЎНЫЯ-Ж МАСЫ УСКЛАДАЮЦЦА ЎСЁ НОВЫЯ ЦЯЖАРЫ, РАСЬЦЕ ТЭРОР І ЎЦІСК.

Вызваляючы [illegible] ад націскам рэвалюцыйнага руху, [illegible] яшчэ больш жорстка душыць нацыянальна-вызваленчы рух: ДА ГЭТАГА ЧАСУ ТРЫМАЕ НА КАТАРЗЕ ПАСЛА ВАЛОШЫНА І ТЫСЯЧЫ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ БАРАЦЬБІТОЎ, УКІНУЎ ЗА КРАТЫ ПАСЛОЎ- «ЗМАГАНЬНЯ» — ГАЎРЫЛІКА, ДВАРЧАНІНА, ВАЛЫНЦА І КРЫНЧЫКА, якія працягвалі і разьвівалі работу Грамады, РАЗЬБІВАЕ ТБШ І АРЫШТОЎВАЕ ЧЛЕНАЎ ГЭТАЕ АРГАНІЗАЦЫІ, СКАСОЎВАЕ ВЫБАРЧЫЯ СЬПІСЫ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЁКУ. У адказ на бурны выбух рэвалюцыйнае барацьбы заходняя-украінскіх мас супроць акупацыі, якія з дымам пажараў пускаюць панскія і асадніцкія двары, фашысцкі ўрад адказвае карнымі экспэдыцыямі, масавымі расстрэламі, кантрыбуцыямі і рознымі зьдзекамі.

ТАВАРЫШЫ! Вызваляючы нас, урад спадзяваўся, як відаць, што мы, паўшы па некалькі год катаржнага хлеба, пойдзем на згоду з уладай, далучымся да выгоднай польскаму фашызму санацыйна-згодніцкай групы Луцкевіча, Астроўскага і К-о і гэтым адцягнем масы ад рэвалюцыйнага нацыянальна - вызваленчага змаганьня. Але ўрад памыліўся: мы, члены Цэнтральнага Камітэту Грамады, засталіся нязломна вернымі сваёй сялянска-рабочай ідэалёгіі і зусім салідарызуемся з лістом старшыні Грамады т. ТАРАШКЕВІЧА, у якім ён выкрывае манэўры ўраду і ганьбуе беларускі фашызм. Праўда, адзін з часовых і выпадковых спадарожнікаў Грамады—Акінчыц—здрадзіў інтарэсам шырокіх працоўных мас. Акінчыц, які ў свой час далучыўся да Грамады і зьяўляўся ў ёй чужым элемэнтам, адышоў ад нас яшчэ будучы ў турме. Усьміхаецца яму з панскай ласкі зварот правоў, адвакатура і пасольскі мандат. Далучыўся ён да буржуазна-кулацкае групы Луцкевіча, Астроўскага і К-о і нават стаў на чале створанага тэй-жа кампаніяй фашысцкага і кулацкага па сваёй ідэалёгіі так званага Цэнтрасаюзнага выбарчага камітэту, каб баламуціць масы пры выбарах у сойм. Але гэта ім ня ўдасца. Беларускія працоўныя масы належным чынам ацэняць здрадніцкую [illegible] Акінчыца і з пагардай адхіляцца ад [illegible] намаганьняў зьбіраюць галасы за фашысцка-здрадніцкія сьпісы. ПРЭЧ ЗДРАДНІКАЎ, ПРЭЧ АШУКАНСТВА! ПРЭЧ САЮЗЬНІКАЎ І ПАДПОРУ ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ—ГРУПУ ЛУЦКЕВІЧА, АСТРОЎСКАГА, ЯКАЯ РАЗАМ З НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТАМІ Ў БССР ВЯДЗЕ ЗМАГАНЬНЕ СУПРОЦЬ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ УЛАДЫ Ў БССР, СУПРОЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ. Ні аднаго голасу не павінна быць дана за сьпісы прыхільнікаў польскага фашызму! Таксама павінен аднесьціся беларускі селянін і працоўны да сьпісаў, выстаўленых Ярэмічамі, Станкевічамі, Багдановічамі ды рознымі Карузамі або Назарэўскімі. Просьбы гэтых паноў або сьпязьлівыя нараканьні на дрэнныя парадкі нічога не дапамогуць працоўнаму народу.

Ня верце таксама вшуканчым абяцанкам розных кірмашовых паноў з «Вызваленьня», «Строньніцтва хлопскага, ППС і «Пяста», што выступаюць цяпер на выбарах пад назваю «Зьвёнзак абароны права і вольнасьці» пад № 7. Не нясуць яны нашаму народу волі, а няволю. Даволі сказаць, што гэтыя партыі ўславіліся тым, што наслалі на нашу зямлю тысячы вайсковых і цывільных асаднікаў. І цяпер гэтыя паны з № 7, водзячыся з Пілсудзкім, усё-ж дбаюць толькі аб тым, каб утрымаць у цэпасьці буржуазную ўладу ў Польшчы. Селяніну і рабочаму не па дарозе з гэтымі вшуканцамі. Толькі сапраўдны сялянска-рабочы ўрад зьменшыць падаткі, вызваліць ад падаткаў безьзямельнае сялянства, малазямельнае і серадняцкае, дасьць дармова зямлю сялянству і забясьпечыць інтарэсы рабочых. Толькі рабоча-сялянскія сьпісы могуць даць пры сучасных выбарах у сойм такіх прадстаўнікоў, якія дапамогуць у арганізацыі працоўных мас да рушачага змаганьня за ўладу сялян і работнікаў.

ТАВАРЫШЫ! Ня верце абяцанкам розных панкоў як з польскіх, так і з беларускіх фашысцкіх партый аб тым, што буржуазны сойм і буржуазная дэмакратыя паправіць быт працоўных мас, дасьць зямлю, дабрабыт, асьвету на роднай мове і інш. ГЭТА АШУКАНСТВА. Сойм, які зацьвярджае гадавы бюджэт да трох мільярдаў злотых, сьцягваных з нас у выглядзе крывавых падаткаў, НА ПАЛІЦЬЮ, ТУРМЫ, НА ВОЙСКА І НА ЎЗБРАЕНЬНЕ, НЕ ПАЛЕПШЫЦЬ ВАШАЙ ДОЛІ. НЕ ПРАЗ СОЙМ ВЯДЗЕ ДАРОГА ДА ЛЕПШАЙ БУДУЧЫНІ, А ПРАЗ УПАРТАЕ ЗМАГАНЬНЕ З БУРЖУАЗНЫМ ЛАДАМ. ПРАЗ БЯЗУПЫННАЕ ЗМАГАНЬНЕ [illegible] ФРАНТОХ, ПРАЗ [illegible] ШУЧАЕ ЗМАГАНЬНЕ ЗА ШТОДЗЕННЫЯ ПАТРЭБЫ ПРАЦОЎНЫХ МАС.

Мы заклікаем вас ня ўхіляцца ад галасаваньня, а прыняць самы гарачы ўдзел у справе выбараў для арганізацыі і мабілізацыі сваіх сіл на рашучае змаганьне з фашысцкай дыктатурай, з усімі яе прыхільнікамі і прыхвасьнямі, на змаганьне з акупацыяй. Галасуючы за рабоча-сялянскія сьпісы, вы пакажаце сваю сілу, пакажаце, як памножыліся рады сьвядомых змагароў за інтарэсы працоўных. Фашызм скасоўвае рабоча-сялянскія сьпісы, але ўсе грамадой галасуйце нават за скасаваныя сьпісы. Гэтым пакажаце вы сваю палітычную сьпеласьць і арганізаванасьць, гэтым пакажаце вы непахіснасьць сваёй волі да змаганьня.

Таварышы! Усе на выбары! Падавайце свае галасы толькі за рабоча-сялянскія сьпісы.

Прэч фашысцкі ўрад!

Прэч беларускіх прыхвасьняў польскага фашызму!

Прэч кулацка-пэпэсэўскі № 7, з разьбівачамі саюзу сялян і рабочых!

Няхай жыве сапраўдны рабоча-сялянскі ўрад!

Няхай жыве змаганьне працоўных мас Заходняй Беларусі супроць буржуазнай улады польскага акупанта. Няхай жыве непахісны саюз рабочых і сялян!

СЫМОН РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, ПЁТРА МЯТЛА, МАКСІМ БУРСЭВІЧ.
Беласток.
15-X-30 г.

Партыйнае будаўніцтва

НА БАРАЦЬБУ ЗА КЛЯСАВА БАЯЗДОЛЬНЫЯ ОРГАНЫ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

НАКІРАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ ПАРТ'ЯЧЭЕК

Мабілізаваць клясавую пільнасьць батрацтва, калгасьнікаў і беднаты на змаганьне супроць кулака і яго агентуры ў радох партыі—правых і „левых“ апартуністых

Забясьпечыць бальшавіцкім кіраўніцтвам

Справаздачна - перавыбарчая кампанія сельсаветаў пачалася. Яна будзе адбывацца ў абставінах абвостранага клясавага змаганьня. Клясава-варожыя элемэнты, якія аказваюць шалёнае супраціўленьне пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню, будуць імкнуцца сарваць мерапрыемствы партыі, накіраваныя на ўзмацненьне органаў пралетарскай дыктатуры на вёсцы.

Гэта патрабуе ад партыйных ячэек яшчэ большага павышэньня бальшавіцкай пільнасьці, яшчэ больш шырокага разгортваньня работы па ўздыму клясава-палітычнай сьвядомасьці і актыўнасьці шырокіх мас калгасьнікаў, батрацтва, беднаты і серадняку. Работу па мабілізацыі актыўнасьці гэтых мас трэба разгарнуць так, каб яны заўсёды былі гатовы пад кіраўніцтвам парт'ячэек даць адпор усякім вылазкам кулацтва і іншых сацыяльна-варожых элемэнтаў.

Першарадная задача, якая стаіць перад ячэйкамі, гэта арганізаваць масавую праверку работы сельскіх саветаў. Павінна быць праверана, наколькі сельсавет праводзіў выразную клясавую лінію, наколькі ён быў сапраўдным баявым кіруючым штабам па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, наколькі сельсавет сваім кіраўніцтвам забясьпечваў няўхільны рост сацыялістычных элемэнтаў на вёсцы. Адначасова трэба зьвярнуць увагу на тое, як сельскія саветы, ажыцьцяўляючы наказы, даныя ім у часе мінулых перавыбараў, абаранялі інтарэсы батрацтва і беднаты і арганізоўвалі масы для наступленьня на кулацтва. Ацэньваць работу сельсавету пры яе праверцы трэба грунтуючыся на тым, наколькі сельсавет арганізоўваў масы на выкананьне важнейшых палітычна - гаспадарчых кампаній на вёсцы. Выкананьне плянаў збожжазагатовак, мабілізацыя сродкаў насельніцтва, с.-г. кампаніі, ільнязагатоўкі, выкананьне плянаў па адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам і інш. — вось вымернікі работы сельсавету. Не павінны быць абойдзены і пытаньні культурнага будаўніцтва. Разгортваньне ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыя няпісьменнасьці, садзейнасьць у рабоце культурна-асьветных устаноў вёскі — усе гэтыя пытаньні ўскладаюць на сельсаветы рад задач. Таму самым дасканалым парадкам трэба праверыць як сельсаветы справіліся з іх практычным ажыцьцяўленьнем.

Па ўсіх гэтых асноўных моментах партыйныя ячэйкі павінны забясьпечыць праверку работы сельсаветаў праз заслухоўваньне справаздач фракцый на бюро ячэек, праз арганізацыю шырокай справаздачнасьці сельсаветаў перад выбаршчыкамі, праз арганізацыю масавай праверкі работы сельскіх саветаў (брыгадныя абсьледваньні і інш.). У праверачную работу павінны быць шырока ўцягнуты масы калгасьнікаў, батрацтва, беднаты і серадняку.

З посьпехам правесьці перавыбары сельсаветаў, гэта значыць мабілізаваць масы вакол важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, гэта значыць узмацніць сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, гэта значыць, нарэшце, стварыць моцныя органы пралетарскай дыктатуры, якія-б у поўным сэнсе слова былі здольныя па-бальшавіцку кіраваць справай сацыялістычнага будаўніцтва. Выкананьць гэтыя задачы партыйныя ячэйкі здолеюць толькі пры тым умове, калі самыя перавыбары будуць праходзіць пры высокай палітычнай актыўнасьці батрацтва, калгасьнікаў, беднаты і серадняцкіх мас вёскі. Партыйныя ячэйкі павінны адпаведным парадкам кіраваць практычнай дзейнасьцю выбарчых камісій з тым, каб забясьпечыць 100-процантную яўку выбаршчыкаў на перавыбарчыя сходы. Выбарчыя вучасткі павінны быць заснаваны так, каб давалі поўную магчымасьць выбаршчыкам прымаць актыўны ўдзел у выбары саветаў. Надзвычай вялікую ролю адыгрывае ў справе забясьпячэньня яўкі своячасовае паведамленьне выбаршчыкаў аб дні і месцы сходу. Тут партыйныя ячэйкі павінны ўжыць усе захады, усе меры для таго, каб ня было ніякіх упушчэньняў з боку выбарчых камісій, каб позвы аб яўцы на сходы былі заўчасна разасланы выбаршчыкам.

Мы падкрэсьлілі ўжо, што ў сельскія саветы павінны быць выбраны тыя таварышы, якія ў поўнай меры здольны ажыцьцяўляць кіраўніцтва сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі. Партыйныя ячэйкі павінны растлумачыць шырокім масам калгасьнікаў, беднаты і серадняку тое, што, толькі выбіраючы ў саветы камуністых і беспартыйных батракоў, калгасьнікаў, беднату і серадняцтва, якія сябе праявілі на фронце клясавага змаганьня за калгасы, супроць кулацтва, яны забясьпечваюць далейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, што толькі выбраныя сельсаветы змогуць няўхільна паляпшаць добрабыт калгасьнікаў, беднаты і батрацтва. У сельскія саветы павінны быць выбраны лепшыя ўдарнікі з калгасьнікаў, перадавыя актыўнейшыя батракі і беднякі, а таксама і сераднякі, якія паказалі сябе стойкімі ў змаганьні супроць кулацтва.

Партыйныя ячэйкі павінны забясьпечыць бальшавіцкае кіраўніцтва ходам самых справаздачна-перавыбарчых сходаў. Кулацкія элемэнты праз сваіх падпявалаў — падкулачнікаў будуць імкнуцца сарваць ход перавыбараў сельскіх саветаў, будуць імкнуцца павярнуць работу перавыбарчых сходаў у бок, патрэбны інтарэсам сацыяльна-варожых сіл вёскі. Таму пільнасьць і кіраўніцтва партыйных ячэек і іх прадстаўнікоў на перавыбарчых сходах павінны быць надзвычай моцныя.

«Зьвязда» на сваіх старонках будзе шырока асьвятляць удзел і кіраўніцтва парт'ячэек перавыбарчай кампаніяй. Партыйцы, якія працуюць на вёсцы, павінны дзяліцца праз газэту вопытам змаганьня за моцныя органы пралетарскай дыктатуры, павінны выкрываць правых апартуністых, якія здаюць клясавыя пазыцыі кулацтву.

Толькі бязьлітасным змаганьнем супроць кулацтва і яго агентуры ў радох партыі — правых і «левых» апартуністых, толькі мабілізацыяй шырокіх мас калгасьнікаў, батракоў, беднаты і серадняку вакол генэральнай лініі партыі, партыйныя ячэйкі забясьпечаць выкананьне тых задач, якія паставіла партыя перад кампаніяй перавыбараў саветаў.

А. З—ч.

Пра палову выбаршчыкаў забылі

Астрашыцка-гарадзецкая парт'ячэйка на сваім агульным сходзе 20 лістапада абмеркавала плян перавыбараў сельсавету. Сход, разглядаючы гэта важнейшае пытаньне, зусім выпусьціў з-пад увагі прыцягненьне да ўдзелу ў перавыбарах савету жанчын: калгасьніц, бяднячак і сераднячак—адзіная асобніц.

Наперакор зусім выразным дырэктывам райкому, ячэйка нават і ня думала разгортваць падрыхтоўчую работу да перавыбараў сельсавету сярод дэлегатак і шырокіх мас працоўных жанчын.

Сваю слабасьць парт'ячэйка праявіла пытаньні ў парадак дня, праўда, з абмежаваным рэглямантам.

Аб выстаўцы — 2 мінуты.

Аб партвучобе — 2 мінуты.

Аб рыбнай гаспадарцы — 2 мінуты.

Аб рабоце т-ва «Бязбожнік» — 2 мінуты.

Аб МОПР'ы — 2 мінуты.

Аб Асоавіяхіме — 2 мінуты.

Зразумела, што фактычна гэтыя пытаньні засталіся нявырашанымі, але затое сакратар РК застаўся задаволеным, што прапусьціў іх па пратаколе «на ўсякі выпадак»...

«Мы, бачыце, займаліся, мы вырашалі...».

Стаўка Фахэнгаўза на «страхоўку» колькасьцю запісаных у пратаколах пытаньняў і бесьперапыннымі пасяджэньнямі павінна сустрэць адпор з боку ранёнай партыйнай арганізацыі, як чыноўніцка-бюракратычная правя.

ВЕДАЮЧЫ.

Замест кіраўніцтва-засядацельская мітусьня

Чарэйскі райком КП(б)В, замест пастаяннага жывога кіраўніцтва работай ячэек, разводзіць «засядацельскую» мітусьню, займаецца «дерганьем» кіруючых работнікаў раённых органаў. Пытаньні ставяцца на абмеркаваньне бюро РК без папярэдняй падрыхтоўкі. У выніку гэтага, ня гледзячы на адрыў 7-8 гадзін часу на вырашэньне аднаго пытаньня, яны вырашаюцца павярхоўна, іншыя зусім змазваюцца пропускам праз бюро ці нараду для фармальнасьці. Зьвернемся да некаторых фактаў.

6 кастрычніка. Партыйная нарада цягнулася ад 3 гадз. дня да 12 гадз. ночы.

7 кастрычніка. Пасяджэньне бюро РК — ад 2 гадз. дня да 2 гадз. ночы.

8 кастрычніка — зноў нарада ад 2 гадз. дня да 6 гадз. раніцы.

39 гадзін затрачанага часу на пасяджэньні і нарады за тры дні засаб не вымагаюць асаблівых каментараў, каб давесьці наяўнасьць «засядацельскай маніі» сакратара РК тав. Фахэнгаўза.

На нарадзе, якая пачалася 8 кастрычніка, тав. Фахэнгаўз у 6 гадз. раніцы паступнага дня ўносіць дадатковыя

Далучаем свой голас пратэсту

З тае прычыны, што мы ня прысутн

ПЕРАВЫБАРЫ САВЕТАЎ

Скарыстаем перавыбарчую кампанію для далейшага ўздыму актыўнасьці і энтузіязму мас, для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны

Пашлем у сельсаветы—здольных змагацца за лінію партыі, супроць кулака, за новы калгасны прыліў

Работа цэнтральнай выбарчай камісіі, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ зусім нездавальняючая і сьведчыць аб недаацэнцы важнейшай палітычнай кампаніі—перавыбараў саветаў. Гэту недаацэнку нельга інакш кваліфікаваць як правы апартунізм на практыцы.

100-процантным удзелам у перавыбарах саветаў пакажам падпальшчыкам вайны—Пуанкарэ, агентам інтэрвэнцыі—Рамзіным і Ларычавым, контр-рэвалюцыянэрам з лягеру беларускіх нацыянал-дэмакратаў—Лёсікам і Ластоўскім, што рабочая кляса і працоўныя масы БССР пільна стаяць на варце заваяваньняў Кастрычніка

Разаб'ем перадвыбарныя манэўры кулака.

Мабілізуем калгасьнікаў, батракоў і бядняцка-серадняцкія масы сялянства на барацьбу з клясавым ворагам. Правядзем перавыбары саветаў па-баявому.

Рэйд ЦО „Правды" і „Зьвязды"

ЦО «Правда» і рэдакцыя «Зьвязды» арганізавалі рэйд брыгад для абсьледаваньня, як рыхтуюцца цэнтральныя ўстановы БССР да перавыбараў саветаў.

Брыгады абсьледавалі падрыхтоўку да перавыбараў цэнтральнай выбарчай камісіі, ЦК ЛКСМБ, Наркамасьветы, Менгарсавету, ЦСПСБ.

У цэнтральнай выбарчай камісіі

Брыгада з т. т. ПІДАРЭНКА, ГАРБАЛЕНІ, якая абсьледвала ЦЭНТРАЛЬНУЮ ВЫБАРЧУЮ КАМІСІЮ даносіць, што падрыхтоўку да перавыбараў камісія пачала ў першай палове кастрычніка. Брыгада адзначае слабое наведваньне пленумаў цэнтральнай выбарчай камісіі: з 22 членаў прысутнічала 10-12.

Ня было жывога кіраўніцтва і сувязі цэнтральнай выбарчай камісіі з раёнымі.

Прадстаўнікі цэнтральных устаноў, якія выяжджалі ў раёны, не займаліся праверкай падрыхтоўкі да перавыбараў. Гэта гаворыць аб тым, што праверка падрыхтоўкі да перавыбараў ня была ўвязана з іншымі кампаніямі.

На пасяджэньнях цэнтральнай выбарчай камісіі за ўвесь час быў эслухан толькі адзін даклад раённай камісіі аб ходзе падрыхтоўкі: рабіла справаздачу Барысаўская райкамісія. Вызначаныя, паводле пляну, даклады сельскіх камісій не заслухоўваліся.

За ўвесь час яе абсьледван ні адзін раён. Цэнтральная камісія мала што ведае, як ідзе падрыхтоўка ў раёнах БССР.

Інструкцыі аб перавыбарах не разасланы ўсім раёнам. Брашура, напісаная сакратаром ЦВК т. Хацкевічам, дагэтуль на выпушчана з друку—БДВ затрымлівае друкаваньне брашуры.

Брыгада адзначае, што Саюзтрансарвяў рассылку матар'ялаў да перавыбараў. Некаторыя раёны атрымалі па 2 пасылкі, а многія ніводнай.

У цэнтральным саюзе прафсаюзаў

Брыгада, якая правяраала работу ЦСПСБ, у складзе т. т. СІМОНЕНКА, БУРЛЫКА і ЗІЛЬКАВА, паведамляе, што ЦСПСБ толькі 22-га лістапада пачаў практычную падрыхтоўку да перавыбараў: была склікана нарада старшынь ЦП, райпрафбюро і гарадзкіх прафсаветаў. Была праведзена нарадa старшынь ФЗМК, але на ім прышло сельмі мала людзей—з 300 чал. зьявілася ня больш 30.

БРЫГАДА ПАДКРЭСЬЛІВАЕ, ШТО ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАВЫБАРАЎ АБМЯКОЧВАЛАСЯ ДЫРЭКТЫВАМІ, ЯНА НЕ ПРАСЯКЛА Ў ШЫРОКІЯ РАБАЧЫЯ МАСЫ, НЕ АХАПІЛА ШЫРОКАГА АКТЫВУ, НЯ ВЫШЛА ЗА ЛЕЖЫ ГАБІКЭТАЎ.

Выключэньнем ЦП саюзу мэталістаў, цэнтральныя праўленьні саюзаў толькі зараз пачынаюць разварушацца. Недапушчальна адстаюць саюзы харчавіку, савецкіх і гандлёвых служачых.

У сваіх высадах брыгада адзначае, што ЦСПСБ пачаў падрыхтоўку са значным спазьненьнем, што плян падрыхтоўкі ішчэ не даведзены да буйных прадпрыемстваў, да рабочага-выбаршчыка.

У ЦК ЛКСМБ

Брыгада, у складзе т. т. ГУЦЬКО І БАГДАНАВАЙ, якая пабывала ў ЦК ЛКСМБ, даносіць:

— Ішчэ 30 кастрычніка бюро ЦК ЛКСМБ вынесла пастанову аб удзеле камсамолу ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў. Брыгада, азнаёміўшыся з гэтай пастановай, знаходзіць, што ў ёй упушчана пытаньне аб асобнай рабоце з дзяўчынамі, нічога не сказана аб ролі друку (насьценгазэт), забыта нацыянальнае пытаньне.

Апрача гэтай пастановы, ніякіх дадатковых дырэктыў не давалася.

На працягу месяца мала што зроблена для рэалізацыі пастановы: ня выдана брашура аб удзеле камсамолу ў перавыбарах, не апублікавана адозва ЦК і г. д.

Слаба асьвятляе ход падрыхтоўкі орган ЦК ЛКСМБ—«Чырвоная Зьмена».

Дагэтуль у ЦК няма ніякіх матар'ялаў аб удзеле камсамолу ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Не праверана, як ажыцьцяўляюць пастанову бюро ніжэйшыя камсамольскія арганізацыі.

Зараз ЦК мяркуе правесьці мабілізацыю 200 камсамольцаў для ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі.

Амаль што нічога не зрабіў Фрунзаўскі райкам камсамолу. Вынесена толькі адна пастанова па пытаньні аб падрыхтоўцы перавыбараў. Райком ня ведае, як разгортваецца падрыхтоўка ў нізавых камсамольскіх ячэйках.

У Менскім гарсавеце

Брыгада, з т. т. ЮХНАЎЦА, ЯНОЎСКАГА І ВЯЛІЧКА, абсьледвала падрыхтоўку Менскага гарсавету да кампаніі. Брыгада праведамляе, што сакратар гарсавету т. Пасынкоўскі ў пачатку адмовіўся прыняць брыгаду, заявіўшы, што яму няма часу, але, калі брыгада паставіла пытаньне рубам: «калі ў вас няма часу інфармаваць нас», Пасынкоўскі [illegible] і даў брыгадзе патрэбныя весткі.

За час з 21 кастрычніка гарадзкая выбарчая камісія правяла два пасяджэньні. Усім прафэсіянальным, гарадзкім арганізацыям прапанавана прыняць пляны падрыхтоўкі да перавыбараў, арганізаваны сельсавет, Фрунзу, але прыгарадны сельсавет, Фрунзаўскі і Кастрычніцкі РК камсамолу ня прыслалі ніякіх планаў. У пляне, складзеным ЦСПСБ, зусім мала сказана аб практычнай рабоце прафэсіяльных арганізацый. На абодвух пасяджэньнях гарадзкой выбарчай камісіі ня было прадстаўнікоў камсамолу.

Выбарчая камісія ішчэ не прагледзела [illegible] выбаршчыкаў. Работа па разьбіўцы гораду на выбарчыя вучасткі выкавана напаполу.

Праведзена нарада загадчыкаў школ. Выбарчая камісія выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва Гомельскую і Віцебскую камісіі.

Наогул, канстатуюць брыгады, цэнтральныя ўстановы слаба падрыхтаваліся да справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Галавная задача цэнтральных арганізацый—нагнаць упушчанае, перабудаваць на ходу.

Палітычныя задачы перавыбараў саветаў

А. ЧАРВЯКОЎ

Па БССР пачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў.

Гэта кампанія мае вялізарнейшае палітычнае значэньне. Палітычным зьместам кампаніі павінны служыць усе вялізарныя задачы сучаснага пэрыяду, як разгорнутага пэрыяду сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

Далейшае ўзмацненьне кіруючай ролі камуністычнай партыі, як авангарду рабочае клясы ў барацьбе за сацыялізм, барацьба за генэральную лінію партыі, за індустрыялізацыю краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі; барацьба за пяцігодку за чатыры гады; уздым і арганізацыя новай хвалі бядняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы і ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі; разгортваньне культурнай рэвалюцыі; высьвятленьне міжнароднага становішча Савецкага Саюзу ў сувязі з вykрытымі плянамі інтэрвэнцыі з боку міжнародной буржуазіі і адбываючымся працэсам шкодківаў — («прампартыі») — агентуры інтэрвэнтаў; растлумачэньне мірнай палітыкі савецкай улады і ўсямернае ўзмацненьне абароназдольнасьці Савецкага Саюзу і баяздольнасьці Чырвонай армії; высьвятленьне асноў ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі і рашучая барацьба супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць беларускага нацыянал - дэмакратызму—агентуры польскага фашызму і капіталістычнай інтэвэнцыі; узмацненьне барацьбы на два фронты—супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага, супроць «левых» загібаў, супроць даўрушніцтва, права-«лявацкага» блёку і прымірэнчых да іх адносін; супроць рознавіднасьці апартунізму ва ўмовах нацыянальных рэспублік—нацыянал-апартунізму; узмацненьне савецкай дзяржавы, як дзяржавы дыктатуры пралетарыяту; узмацненьне сувязі ўсіх Саюзных Савецкіх Рэспублік у Саюзе ССР — вось тыя асноўныя пытаньні, навакол якіх трэба мабілізаваць увагу рабочае клясы, калгасьнікаў, бядняцка - серадняцкага сялянства і ўсіх працоўных Савецкай Беларусі ў часе перавыбарчай кампаніі.

Уся праца па перавыбарах саветаў павінна быць шчыльна зьвязана з вырашэньнем чарговых палітычна-гаспадарчых задач.

Імкненьне праводзіць перавыбары саветаў, адарваўшы гэту справу ад іншых нашых задач, зрабіць перавыбары саветаў «чарговай» кампаніяй, паказвае на неразуменьне і апартуністычную недаацэнку палітычнага значэньня справаздачна - перавыбарчай кампаніі. Трэба на кожным выбарчым сходзе зьвязваць высьвятленьне ўсіх асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва з практычным прапампеньнем іх у працы саветаў.

У выніку гэтага справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ў яшчэ большай меры садзейнічаць мабілізацыі сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва і перамогу труднасьцяй росту. Далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, уздым увагі вакол пытаньняў сустрэчнага прамфінпляну і, на падставе гэтага, поўнае выкананьне прамфінпляну асобнага кварталу; барацьба супроць прарываў у выкананьні пляну заготовак ільну, бульбы і збожжа, мабілізацыі сродкаў насельніцтва; далейшае ўцягваньне ў калгасы бядняцка-серадняцкага сялянства і ішчэ больш рашучы паваротсельсаветаў таарам да калектывізацыі; праверка выкананьня пляну па ўсеагульным навучаньні і г. д. — усё гэта павінна зьявіцца практычным вынікам справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Важнейшае значэньне ў часе перавыбараў маюць СПРАВАЗДАЧЫ САВЕТАЎ. Трэба, каб справаздачы саветаў адбілі ўсе мерапрыемствы савецкай улады па сацыялістычным будаўніцтве і іх практычнае прапампеньне ў дзейнасьці данага савету. Трэба, каб гэта справаздача была падпарадкавана самай суровай пралетарскай крытыцы і самакрытыцы, каб, паказваючы дадатныя бакі працы саветаў, накіраваць агонь супроць праяў шкодніцтва, бюракратызму, апартунізму, супроць усіх клясава-чужых элемэнтаў, якія прымазаліся да саветаў, каб ачысьціць саветы ад усіх варожых элемэнтаў.

Аднак трэба «АДРОЗЬНІВАЦЬ САМАКРЫТЫКУ ЎНУТРЫ СЫСТЭМЫ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ АД КРЫТЫКІ ЗВОНКУ. Клясаваму ворагу і яго агентуры ў нашых радох мы не дазволім СВАЁЙ крытыкай падмяняць НАШУ самакрытыку» («Правда»).

Перавыбары саветаў будуць адбывацца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулакі, попы і інш. варожыя элемэнты будуць імкнуцца да таго, каб выкарыстаць перавыбарчую кампанію ў сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах, каб дыскрэдытаваць дзейчасьць і мерапрыемствы савецкай ўлады, каб падпарадкаваць свайму ўплыву несьвядомыя элемэнты, каб правесьці ў саветы сваіх агентаў, каб дэзарганізаваць работу саветаў. Вось гэта вымагае таго, каб партыйныя арганізацыі забясьпечылі моцнае бальшавіцкае кіраўніцтва перавыбарамі саветаў. Партыйныя арганізацыі ў часе кампаніі павінны ўзмацніць сваю пільнасьць, папярэджваючы і выпраўляючы найменшыя спробы працягнуць погляды правых і «левых» ухілістых і погляды права-лявацкага» блёку, а таксама нацыянал-апартуністычныя погляды. Стопроцантнае ўцягненьне ў перавыбары рабочых у горадзе; арганізацыя і замацаваньне пралетарскага ўплыву і кіруючай ролі пралетарыяту ў перавыбарах на вёсцы; арганізаваны ўдзел у кампаніі калгасьнікаў, ажыцьцяўленьне працы бядняцка - батрацкіх груп у вёсцы; ішчэ большае ўзмацненьне саюзу рабочае клясы з серадняком пры апоры на калгасьнікаў і батрацка - бядняцкія масы вёскі для рашучай барацьбы з кулацтвам — вось тыя сілы, на якія абапіраецца кампартыя ў барацьбе за сацыялізм і якія асабліва актыўна павінны рухацца ў часе перавыбараў для рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты ў горадзе і вёсцы, для своячасовага і бязьлітаснага адпору клясавым ворагам.

Клясавы вораг будзе імкнуцца, як паказала практыка мінулых перавыбараў, выкарыстаць палітычна несьвядомую частку сялянак, накіроўваючы іх супроць мерапрыемстваў савецкай улады. Таксама ўжо вызначаюцца імкненьні кулацтва, кляркалаў і інш. антысавецкіх элемэнтаў выкарыстаць нацыянальныя асаблівасьці для таго, каб пад прыкрыцьцём буржуазнага лёзунгу адзінага нацыянальнага фронту разьбіць у сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах інтэрнацыянальны фронт працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

На ўсе, найбольш слабыя вучасткі, праз якія імкнецца прапезьць наш клясавы вораг — трэба зараз-жа зьвярнуць увагу і зрабіць гэтыя вучасткі прыкладнымі ў барацьбе за сацыялізм.

Больш увагі да падрыхтоўкі працоўных жанчын у саветы, асабліва ў вёсцы. Трэба абавязкова выканаць пастанову ЦВК аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы працоўных жанчын да перавыбараў у саветы, правёўшы спэцыяльныя падрыхтоўчыя нарады, падрыхтаваўшы кандыдатуры і г. д. Трэба арганізацыйна ахапіць узросшую актыўнасьць працоўных жанчын і накіраваць яе на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба ў адпаведнасьці са значна узросшай удзельнай вагой жанчын у прамысловасьці і сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі павялічыць ролю працоўнай жанчыны ў саветах.

Таксама важна выканаць дырэктывы аб увазе да перавыбараў у саветы сярод нацменшасьцяй. Трэба ў часе перавыбараў выкрыць самым шырокім масам працоўных буржуазную сутнасьць адзінства нацыянальнага фронту, мабілізаваць бядняцка - серадняцкую частку нацыянальнай вёскі да рашучага адпору кулацтву і яшчэ больш замацаваць інтэрнацыянальнае адзінства працоўных усіх нацыянальнасьцяй для барацьбы за сацыялізм.

Для найбольш пасьпяховага правядзеньня перавыбарчай кампаніі зроблены самыя падрабязныя ўказаньні, прычым амаль кожная з іх мае палітычнае значэньне. Такімі паказаньнямі зьяўляюцца пастановы аб складаньні сьпісаў выбаршчыкаў і пазбаўленых выбарчага права, аб выбарчых вучастках, аб выбарчых камісіях, аб складаньні справаздач, аб наказах, аб правядзеньні сходаў і г. д.

Самым шкодным для сацыялістычнага будаўніцтва будзе няўважлівасьць да гэтых дырэктыў, фармальнае іх выкананьне, абы адбыць «чарговую» кампанію. Перавыбарчы сход, праведзены фармальна, толькі для таго, каб выканаць дырэктыву, без патрэбнай палітычнай падрыхтоўкі і адпаведнага палітычнага месту, робіцца палітычна шкодным. Вось чаму патрэбна самае актыўнае кіраўніцтва перавыбарчай кампаніяй з боку ўсіх партыйных ячэек і партыйных камітэтаў.

Важнейшую арганізуючую ролю ў перавыбарчай кампаніі павінен адыграць друк. Друк павінен давесьці да ведама самых шырокіх мас працоўных нашы вялізарныя дасягненьні, растлумачыць праграму далейшага сацыялістычнага будаўніцтва на аснове пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б, выкрываць прарывы ў выкананьні чарговых задач і мабілізаваць масы на іх перамогу. Друк павінен шырока высьветліць той вялізарны ўздым энтузіязму рабочае клясы і ўсіх працоўных, якім яны адказалі на контр-рэвалюцыйнае шкодніцтва і хітрыкі імпэрыялістых.

ПРАЛЕТАРСКІ ГОРАД ПАВІНЕН ПРЫЙСЬЦІ НА ДАПАМОГУ ВЁСЦЫ. Гэта вымагаецца асабліва тым, што гэтыя перавыбары упяршыню будуць адбывацца пасьля пераходу на раённую сыстэму кіраўніцтва. ШЭФСКІЯ ТАВАРЫСТВЫ, ПААСОБНЫЯ БРЫГАДЫ ПА ПЕРАВЫБАРАХ ПАВІННЫ НАКІРОЎВАЦЦА Ў РАЁН, СЕЛЬСАВЕТ, ВЁСКУ.

Апіраючыся на сацыялістычнае асяродзішчы вёскі — саўгас, прамысловае прадпрыемства, калгас — неабходна разгарнуць шырокім фронтам наступленьне на капіталістычныя элемэнты.

Трэба дамагацца, каб у выніку перавыбараў значна палепшыць клясавы склад саветаў: рабочы-ўдарнік, калгасьнік і лепшыя прадстаўнікі бядняцка-серадняцкага сялянства клясава-вытрыманыя і адданыя партыі і савецкай уладзе павінны ўвайсьці ў склад саветаў.

Гэта замацуе саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту, зробіць іх яшчэ больш баяздольнымі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе за поўнае выкарчоўваньне капіталістычных карэньняў у нашай краіне, у барацьбе за сацыялізм.

Работа ідзе поўным тэмпам

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАРА. (Наш кар.) Чырвоналабодзкія раённыя арганізацыі разгарнулі шырокую падрыхтоўку да перавыбараў саветаў. 10 лістапада сельсаветы былі разьбіты на выбарчыя вучасткі; да кожнага сельсавету прымацаваны адказны раённы работнік, які адна часова зьяўляецца старшынёю сельскай выбарчай камісіі.

Да 20 лістапада ўжо былі складзены сьпісы выбаршчыкаў, а таксама асоб пазбаўленых выбарчых правоў. У праверцы і складаньні сьпісаў прымалі [illegible] ўдзел батракі, беднякі і калгасьнікі.

Складзены каляндарныя пляны справаздачна-перавыбарчай кампаніі. Сельсаветы разьбіты на 3 групы; па першай групе—справаздачна-перавыбарчая кампанія будзе праводзіцца з 1 па 1[illegible] сьнежня. Па другой групе—з 18 па 2[illegible] сьнежня і па трэцяй групе—з 25 па 3[illegible] сьнежня.

Рэвізійныя камісіі прыступілі да праверкі работы сельсаветаў, удзелу іх у будаўніцтве, калектывізацыі, выкананьні плянаў фінансавых мерапрыемстваў і інш.

Ва ўсіх сельсаветах прыступлена да абгаварэньня і выпучэньня кандыдатур у ўнёсы сёл сельсаветаў. Кандыдатуры абгаварваюцца на сходах бедноты, калгасьнікаў і жанчын.

І. Паўлоўскі.

Пад лёзунгам узмацненьня баявой магутнасьці СССР

Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў супадае з пэрыядам выключнага абвастрэньня ваеннай небясьпекі.

Грандыёзныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, бурны рост індустрыялізацыі, новы калгасны прыліў—выкарчоўваюць апошнія карэньні капіталізму ў СССР, наносяць руйнуючы ўдар надзеям клясавага ворага на крах савецкай сыстэмы і рэстаўрацыю старога ладу.

Магутны рост Савецкага Саюзу выклікае зьвярыную нянавісьць міжнароднага капіталізму да адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Імпэрыялістычныя акулы ня грабуюць ніякімі сродкамі для падрыву магутнасьці краіны Саветаў.

«Дэкада абароны», якая нядаўна скончылася, узварухнула савецкую грамадзкасьць, наблізіла яе да пытаньняў абароны краіны.

Наша задача зараз—замацаваць гэтыя дасягненьні. Перавыбары саветаў павінны прайсьці пад лёзунгам далейшага ўзмацненьня баявой магутнасьці краіны Саветаў.

Чырвоная армія прымае ўдзел у работе саветаў ня толькі пасылкай сваіх дэлегатаў; яна рыхтавала і рыхтуе нямалі кадры масавых работнікаў для вёскі. За тры гады (з 1927 па 1929 г.) праз сетку гурткоў і курсаў было падрыхтавана для савецкай, адміністрацыйнай, каапэрацыйнай і грамадзкай работы на вёсцы 200 тыс. чырвонаармейцаў.

У бягучым годзе часьці Чырвонай армії падрыхтавалі 105 тыс. масавых работнікаў для калгасаў і саўгасаў.

У часе перавыбарчай кампаніі ма павінны выкарыстаць шматтысячныя атрады актывістых і ўдзельнікаў сацыялістычнай будоўлі, якіх штогодна дае краіне Чырвоная армія—арганізаваць чырвоناармейскія брыгады для праверкі работ саветаў ў галіне ўзмацненьня абароны, чырвонаармейскія пераклічкі па перавыбарах саветаў, спэцыяльныя справаздачы вайсковых дэпутатаў на рабочых сходах.

Вялізацыя—гэта трэба проста сказаць—зьяўляецца вусім слабым вучасткам работы саветаў. Вайсковыя сэкцыі гарсаветаў працавалі несыстэматычна; райвыканкомы і сельсаветы аддавалі мала ўвагі пытаньням тэрытарыяльнага будаўніцтва, міжзборавай работы, забесьпячэньня адбору прызыўнікоў у Чырвоную армію, нярбоўкі ў вайсковыя школы, забесьпячэньня сем'яў чырвонаармейцаў. Сельсаветы не давялі нават да калгасу паказаньні Калгасцэнтру аб забесьпячэньні сем'яў чырвонаармейцаў у калгасах.

Перавыбарчая кампанія павінна ўнесьці пералом у вайсковую работу саветаў.

У часьцях Чырвонай армії павінна праводзіцца шырокая растлумачальная работа аб значэньні перавыбараў і ўдзеле ў іх чырвонаармейскай масы. Адзнай з форм работы зьяўляецца пасылка чырвонаармейцамі індывідуальных і калектыўных лістоў у свае сельсаветы, калгасы, саўгасы аб значэньні і задачах перавыбарчай кампаніі. Таксама трэба практыкаваць выклікі сваіх вёсак або калгасаў на сацспаборніцтва на забесьпячэньні 100 проц. удзелу ў справаздачна-перавыбарчых сходах.

Дэмабілізаваныя байцы Чырвонай армії, кінутыя зараз на фронт сацыялістычнага будаўніцтва, павінны памятаць, што абвастрэньне ваеннай небясьпекі патрабуе ад нас узмацненьня органаў пралетарскай дыктатуры, узмацненьня нізавых зьвяньняў савецкага апарату сумленнымі і стойкімі работнікамі. Перавыбары саветаў павінны быць генэральным аглядам, праверкай іх гатоўнасьці і ўменьня працаваць ва ўмовах абвастрэньня ваеннай небясьпекі супроць СССР.

Даць адпор кулакам

БАБОЎСКІ сельсавет не вядзе ніякае работы сярод беднаты. Гэтым карыстаюцца кулакі, якія пояць гарэлкаю беднякоў і вядуць сярод іх антысавецкую агітацыю.

У в. ЧОРНАЯ-ВІРНЯ тры разы склікаўся сход беднаты па перавыбарах саветаў. Аднак, усе тры разы беднякі на сход не зьявіліся, замест іх сабіраліся кулакі і заможныя сераднякі.

Партыйная і камсамольская ячэйкі ў вёсцы працуюць слаба. Кулакі некалькі раз рабілі замах на сакратара ячэйкі, за тое, што ён выкрываў іх учынкі.

Патрэбна неадкладна ўмяшальнасьць адпаведных органаў.

Брыгадзіры ЦСПСБ—Тарыба, Голуб.

Клімавіцкі гарсавет—перад судом выбаршчыкаў

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Распачалася справаздачна-перавыбарчая кампанія Клімавіцкага гарсавету. На справаздачны сход зьявілася 80 проц. выбаршчыкаў. У спрэчках па справаздачы гарсавету выбаршчыкі разгарнулі шырокую самакрытыку. Адзначана, што гарсавет ня здолеў мабілізаваць масы на выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

***

Клімавіцкі райком КП(б)Б мабілізаваў 22 адказных работнікаў для правядзеньня справаздачна-перавыбарчай 1 сельсаветаў.

КАЛГАСНЫ ВЫТВОРЧЫ ПЛЯН

ПАВІНЕН ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ:

выразную арганізацыю працы, гаспадарчы рост калгасу, пашырэньне плошчы пад тэхнічнымі і кармавымі культурамі, новы калгасны прыліў

Райза і калгасная сыстэма яшчэ не пачалі падрыхтоўкі да сяўбы

ПАЧЫНАНЬНЕ КАЛГАСУ „ВЭКЭР"

«Зьвязда» ўжо друкавала *) аб дасягненьнях калгасу «Вэкэр». Вэкэрцы першымі ў БССР адгукнуліся на адозву ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня, уключыўшыся ў барацьбу па ліквідацыі прарываў у іх калгасе.

У выніку сапраўды баявых тэмпаў работы калгасьнікі дабіліся перавыкананьня пляну асеньняй сяўбы на 50 проц., скончылі пабудову вялікай аборы і сьвінарніка, зазяблілі поле, выканалі плян сіласаваньня, своячасова ўбралі бульбу і інш.

У «дзень ударніка» калгасьнікі пачалі распрацоўваць вытворчы плян на будаўнічы год. 22 калгасьнікі, арганізаваныя ў групу пляннавікоў, пад кіраўніцтвам агранома Вільчынскага, самі складалі гэты плян. У асноўным ён зводзіцца да наступнага.

КАЛЯНДАР КАЛГАСЬНІКА НА 1931 ГОД.

Увесь гаспадарчы год разьбіт па адпаведных пэрыядах, выходзячы з тэрміновасьці работ, уліку рабочай і цягавай сілы. Калгасьнікі вызначылі наступныя пэрыяды: першы пэрыяд — з 1-га студзеня па 10 красавіка 1931 г.; другі пэрыяд — з 10 красавіка па 1 чэрвеня; трэці пэрыяд з—1 чэрвеня па 15 ліпеня; чацьверты пэрыяд—з 15 ліпеня па 15 кастрычніка; пяты пэрыяд — з 15 кастрычніка па 31 сьнежня.

На першы пэрыяд калгасьнікі вызначылі ўсю работу па доглядзе жывёлы, па падвозцы сена і канцэнтраваных кармоў, па вывазцы і загатоўцы будаўнічых матар'ялаў, патрэбных для вялікага будаўніцтва, якое будзе праводзіцца ў Веснуу 1931 г.

На другі пэрыяд вызначана бараваньне, ворыва і правядзеньне веснавой сяўбы, для чаго ўся рабочая сіла разьбіта на адпаведныя брыгады. У гэты-ж пэрыяд праводзіцца таксама будаўніцтва новай аборы на 70 штук кароў, 2-х жыльлёвых дамоў і інш.

Трэці пэрыяд прадугледжвае раньняе ворыва папару, касьбу сенажаці, поліва яравых культур і шмат інш.

Чацьверты пэрыяд зьяўляецца адным з адказнейшых пэрыядаў — гэта ўборка ўраджаю, сенажаці, абмалот ураджаю, уборка яблык, асеньняя сяўба і г. д.

Увесь гэты пэрыяд калгасьнікі будуць працаваць з вялікай напружанасьцю нават у дзьве зьмены, па 25 дзён у месяц.

Пяты пэрыяд прадугледжвае ўборку бульбы, зяблева, упакоўку і адпраўку яблык, падрыхтоўку да зімы і догляд жывёлы. Да пятага пэрыяду калгасьнікі вызначылі падрыхтоўку ўсяго Чабатовінкага сельсавету да пераходу яго ў калгас.

АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ

Калгасьнікі абавязаліся ўсе работы выкопваць своячасова, біцца за ажыцьцяўленьне пляну. Зрыўшчыкаў норм вынрацоўкі парашылі браць на грамадзкі буксір.

Практыка гэтага году паказала неабходнасьць арганізацыі адпаведных брыгад на чале з адказнымі брыгадзірамі. Гэта будзе праведзена ў 1931 годзе.

З кастрычніка г. г. уведзена разьмеркаваньне дэфіцытных тавараў па колькасьці і якасьці работы ў калгасе.

Вытворчая парада, якая сёлета бязьдзейнічала, ужо рэарганізавана ў «сквозную» брыгаду

— Калгасьнікі вызначылі таксама вялікую дапамогу беднаце наўкольных вёсак і пасёлкаў коньмі, рабочай сілай і машынамі.

Усе дасягненьні калгасу павінны быць вядомы ўсім адзінаасобнікам нашага сельсавету, — заявілі пляннавікі, складаючы плян.

Для ўзнаямленьня з дасягненьнямі калгасу калгасьнікі прыцягваюць актыў адзінаасобнікаў да работ у калектыве.

Зямляроботва. Ужо ў гэтым годзе калгасьнікі маюць у два разы вышэйшы ўраджай, чым у адзінаасобнікаў. поўнае выкананьне агра-зоамінімуму. Уводзіцца дзевяціпалёвы севазварот.

Пасеў жыта і аўса будзе праведзен выключна гатункоым насеньнем. Выкананьне гэтых мерапрыемстваў павінна значна павялічыць ураджайнасьць.

Так, жыта замест 11 цэнтн. з гэктара ў гэтым годзе дасьць 12 цэнтн. у наступным годзе: авёс замест 10 дасьць 13 цэнт.; грэчка замест 8—8½; вікапасеньне замест 6,5 — 8,5; бульба замест 125 — 155 цэнтн. і г. д.

Жывёлагадоўля. Калгас мае вялікія магчымасьці для разьвіцьця жывёлагадоўлі. Ёсьць адаведная кармавая база — каля 150 гэкт. сенажаці, можна пашырыць плошчу пад канюшыну (каля 40 гэкт.), коранаплоды і г. д.

Малочнае стада вырашана давесьці да 100 штук, замест 75.

Каб паленьніць догляд жывёлы будуецца (ужо канчаецца пабудовай) цёплы, сьветлы хлеў. Уся жывёла разьбіваецца на групы на свёй жывой базе і ўдойнасьці, вызначана кармленьне па нормах. У калгасе будзе ня менш 65 шт. маладняка. Вылучан спэцыяльны жывёлавод.

У галіне разьвіцьця сьвінагадоўлі калгасьнікамі ўжо зроблена многа: пабудаваны сьвінарнік на 120 штук, сьвіное стада даведзена да 70 штук, ёсьць свой кваліфікаваны сьвінавод і інш.

Да 1-га студзеня 1931 году сьвіное стада даводзіцца ня менш, як да 100 штук. У канцы 1931 году гэтае стада будзе налічваць 1.000 шт., з якіх ня менш 200 адкормліваецца на бэкон для здачы пралетарскім цэнтрам. Такім чынам, у сваім пляне калгасьнікі значнае месца адвялі пытаньню рабочага забесьпячэньня.

Усяго калгас мяркуе здаць дзяржаве таварнай прадукцыі на 62.200 руб.

Лік вульлёў пчол з 27 даводзіцца да 100 штук. Колькасьць вульлёў пчол павінна быць павялічана шляхам куплі іх у адзінаасобнікаў. Вызначана правядзеньне раду мерапрыемстваў па захаваньні пчол (пабудова амшаньніка, рамачных вульлёў і інш.). У канцы 1931 году колькасьць сем'яў пчол даводзіцца да 150.

Па садоўніцтве і гародніцтве таксама вызначан рад мерапрыемстваў. Мяркуецца, што сад дасьць па менш 20.000 руб. прыбытку (ёсьць 12 гэкт. саду). Плошча пад гародніцтвам палялічваецца ў два разы.

Увесь валавы прыбытак калгасу будзе складаць 93.061 руб. Пасьля адаведных адлічэньняў умоўна чысты прыбытак гаспадаркі складае 55.171 руб 40 кап.

Публікуючы свой вытворчы плян, калгас «Вэкэр» просіць усе іншыя калгасы выказацца на старонках «Зьвязды» аб яго недахопах.

САВЕЛЬЧЕНКА

Зьмяшчаючы карэспандэнцыю аб вытворчым пляне калгасу «Вэкэр» на 1931 г., рэдакцыя «Зьвязды» выносіць мо на абмеркаваньне шырокіх мас калгасьнікаў, зямельных і калгасных работнікаў. Рэдакцыя просіць выказацца наконт недахопаў пляну калгасу «Вэкэр», каб практыка складаньня вытворчага пляну магла быць улічана іншымі калгасамі.

«Зьвязда» вельмі цікавіць практыка іншых калектываў у складаньні пляну, асабліва як вырашана пытаньне вызначэньня рабочай і цягавай сілы на адыходны промисел (на лесараспрацоўкі), якая канкрэтная работа будзе праведзена па ўцягненьні ў калгас новых членаў, што будзе зроблена, каб павялічыць плошчу пад тэхнічныя і кармовыя культуры.

У прыватнасьці, просім Калгасцэнтр БССР выказацца адносна вытворчага пляну калгасу «Вэкэр».

*) У ну[illegible]

УДАРНІЦЫ САЎГАСУ «ІВАНЬ»

Ідуць спрэчкі

ЖЛОБІН. (НАШ КАР.). ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ Ў РАЁНЕ ЯШЧЭ НЕ ПАЧАЛАСЯ. ПЛЯН ПАПЫРЭНЬНЯ ЯРАВОЙ ПЛОШЧЫ НЕ СКЛАДАЕЦЦА. ІДУЦЬ СПРЭЧКІ З НАРКАМЗЕМАМ. РАЙЗА ПРОСІЦЬ ЗЬМЕНШЫЦЬ ЗАДАНЬНЕ НА 5.000 ГЭКТ.

НІЧОГА НЯ РОБІЦЦА Ў ГАЛІНЕ АРГАНІЗАЦЫІ РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ І С.-Г. МАШЫН. АДНЭЙ З ПРЫЧЫН БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТОЕ, ШТО ПКЗ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЯ ВЫЗНАЧЫЎ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ. НЕВЯДОМА НАВАТ

УДАРНАЯ ДЭКАДА

Вайна—самацеку

Масавай работай на заводзе, вёсцы, калгасе даб'емся посьпеху ў мабілізацыі сродкаў

Данясеньні з месц

У сувязі з ударнай дэкадай мабілізацыі сродкаў насельніцтва, у раёны выехаў рад адказных работнікаў, а таксама спэцыяльныя брыгады, якім даручана дабіцца пералому ў кампаніі.

У рэдакцыю «Зьвязды» пачалі паступаць першыя данясеньні брыгадзіраў.

У паведамленьнях брыгад даецца яскравы малюнак ходу мабілізацыі сродкаў на мясцох. Амаль усе аднадушна падкрэсьліваюць, што пытаньне выкананьня фінансавага пляну не стаяла ў цэнтры ўвагі мясцовых, партыйных і савецкіх арганізацый.

Бяз удзелу грамадзкасьці

Вось што, напрыклад, даносіць брыгадзір НКФ СССР т. **Бэйдаліна.**

— Грамадзкасьць **Аршанскага** раёну надта павольна пераключаецца на ўдарныя тэмпы работы. У лістападзе камісіі садзейнасьці гор. Воршы два разы склікаліся на нараду, але замест 61 чал., прыходзіла 15-16. Раённая камісія садзейнасьці імкнулася правесьці пасяджэньне, але яно сарвалося два разы з-за няяўкі дакладчыкаў.

Зрывалася ват пасяджэньне штабу па правядзеньні ўдарнай дэкады мабілізацыі сродкаў.

У выніку мабілізацыі сродкаў у лістападзе праходзіць горш, чым у кастрычніку. За 20 дзён паступіла 186.000 рублёў, замест 400.000 ру. Толькі спажывецкая каапэрацыя і ЦРК добра выконваюць лістападаўскія плыны збору наёў.

На чыгуначным вузьле рэалізавана пазыкі толькі на 54 проц. 2-х тыднёвай заработнай платы. Шмат рабочых зусім не ахоплена пазыкай.

Запазычанасьць па пазычках у с.-г. крэдытным таварыстве дасягнула 35.000 рублёў.

Плады бязьдзейнасьці

Тав. **М—ў** у сваёй карэспандэнцыі дае малюнак мабілізацыі сродкаў па **Бабруйшчыне.**

У горадзе за прыватнікам лічыцца каля 900.000 руб. запазычанасьці па розных падатках.

Крэдытнае таварыства мае пратэрмінаваных пазычак на 32.000 руб.

Кантрольныя лічбы рэалізацыі пазыкі выкананы на горадзе на 82 проц. На сялянскі двор прыпадае падпіскі толькі на 65-70 кап.

Каапэрацыйныя арганізацыі трымаюць на складах вялікія запасы тавараў на сотні тысяч рублёў. Перажываючы пострах фінансавае становішча, яны, замест хутчэйшай рэалізацыі тавараў, ідуць па лініі найменшага супраціўленьня—патрабуюць грошай у Дзяржбанку.

Апартуністычная недаацэнка кампаніі

Брыгадзір тав. **Чырвонец** паведамляе з **Асьвейскага** раёну, што вынікі мабілізацыі сродкаў дагэтуль нездавальняючыя. Самаабкладаньня паступіла толькі 49,3 проц. заданьня.

Кулацкія гаспадаркі па раёне ня вызьлены і не абкладзены індывідуальна.

Па чарговых узносах па пазыцы «Пяцігодка—за чатыры гады» ёсьць звыш 2-х тыс. руб. запазычанасьці.

Раённая камісія садзейнасьці адпачывае, яна не адчуваецца ні ў мястэчку, ні ў раёне. Яе прыкладу сьледуюць сельскія камісіі садзейнасьці. Загадчык нядаўна арганізаванай раённай ашчадкасы «расчараваўся» ў сваёй рабоце, кожны дзень ён зьбіраецца ўцякаць з мястэчку, шукаючы для гэтага розныя прычыны: «няма сталоў, няма дроў». Аб тым, што няма дроў, ён паслаў нават тэлеграму ў Менск.

Паляводчая каапэрацыя выканала плян паянакапленьня на 0,5 проц. Райкаапсаюз ня склаў нават пляну мабілізацыі сродкаў.

Як адносяцца да кампаніі мясцовыя кіруючыя арганізацыі?

Яны не даацэньваюць значэньня кампаніі—увесь раённы актыў, мабілізаваны на загатоўкі, а каб правесьці мабілізацыю сродкаў бюро РК пастанавіла: «ня супярэчыць» пасылцы па аднаму работніку з некаторых арганізацый у адстаючыя сельсаветы.

Работа ня вышла за межы габінэтаў

Тав. **Пяцеренка** піша з **Сураскага раёну,** што ва многіх арганізацыях наглядаецца чыста апартуністычныя адносіны да ўдарнай дэкады. Інакш, як апартуністычнай, нельга назваць работу каапсаюзу і калгассэкцыі, якія выканалі плян збору наёў толькі на 2,3 проц.

Пазыка «Пяцігодка—за чатыры гады» рэалізавана толькі на 37 проц. заданьня.

Вакол мабілізацыі сродкаў не разгорнута масавай работы, не мабілізавана грамадзкасьць. Парт'ячэйкі па мясцох аддаюць мала ўвагі кампаніі. Прафарганізацыі і сельсаветы ня цікавяцца ходам мабілізацыі.

Райком КП(б)Б адзначыў, што кампанія мабілізацыі сродкаў дрэнна праходзіць з-за адсутнасьці масавай работы: работа ня выйшла за межы габінэтаў. Але райком не ацаніў бязьдзейнасьці ў кампаніі, як апартуністычную практыку, на якой трэба бязьлітасна ўдарыць.

Патрэбны рашучыя меры

Тав. **А. Юшкевіч** з **Чэрвеньскага раёну** даносіць, што вынікі мабілізацыі сродкаў сыгналізуюць зрыў плянавых заданьняў.

Спажывецкая каапэрацыя раёну праяўляе праваапартуністычныя адносіны да мабілізацыі сродкаў. З 18.000 руб. запазычанасьці мінулага году і 25.000 рублёў заданьня ўдарнага кварталу, сабрана толькі 10.000 руб.

Спажывецкая каапэрацыя атрымала таксама заданьне рэалізаваць сярод пайшчыкаў аблігацый на 1.000 руб.— дагэтуль не рэалізавана ні адной аблігацыі.

З 36 калгасаў падпіску на пазыку афромілі толькі 5.

Сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва, атрымаўшы заданьне рэалізаваць за налёўныя сродкі сярод сялян-адзінаасобнікаў аблігацый на 1.000 руб., не прадала ні адной аблігацыі.

Па самаабкладаньні не спагнана 44.000 руб. або 58 проц. агульнай сумы.

Актыў раёну не мабілізаван на работу па мабілізацыі сродкаў.

Тав. Юшкевіч патрабуе рашучых мер да апартуністых, якія зрываюць выкананьне плянавых заданьняў.

***

За час ударнай дэкады трэба разгарнуць самую шырокую масавую кампанію на вёсцы, уцягнуць у работу ўвесь актыў, дабіцца пэўнага зруху, лабіцца поўнага выкананьня плянаў мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Сьнежань—месяц напружанай работы

Наркамфін БССР разаслаў ліст усім раённым і гарадзкім райфінаддзелам і асобна ўпаўнаважаным, у якім падкрэсьліваецца, што сьнежань павінен быць месяцам самай напружанай работы па мабілізацыі сродкаў.

Фінапарат павінен стаць баявым штабам барацьбы за выкананьне пляну. Фінаддзелам прапануецца дабіцца канцэнтрацыі сіл усіх арганізацый вакол кампаніі мабілізацыі сродкаў.

Работа павінна праводзіцца мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва.

У бліжэйшыя дні трэба скончыць спагнаньне абавязковых плацяжоў і самаабкладаньня, неадкладна сабраць абавязковыя плацяжы з кулацкіх гаспадарак і скончыць праверку індывідуальнага ападаткаваньня.

У гарадох трэба ліквідаваць запазычанасьць па кватэрнай плаце і іншых камунальных плацяжоў, шырока ўжываючы мэтады безнаўпыных разьлікаў.

Фінапарат павінен зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на рэалізацыю таварных фондаў, не дапускаючы накапленьня тавараў, самымі рашучымі мерамі змагацца з выпадкамі неакуратнай здачы выручкі ў касы Дзяржбанку.

На працягу ўдарнай дэкады трэба выканаць квартальны плян па ўсіх відах добраахвотных плацяжоў—укладах, паёх і г. д.

„Творчасьць" Глускага райфінаддзелу

Глускі райфінаддзел, ня выканаўшы заданьня па рэалізацыі пазыкі, паслаў Наркамфіну весткі аб ходзе адпіскі, у якіх лічбы значна перавялічаны.

Шляхам «очковтирательства» райфінаддзел хацеў паказаць добрую работу па рэалізацыі пазыкі.

Калі работнікі НКФ правяралі ход падпіснай кампаніі на раёне, выявілася, што на групе рабочых і служачых сума падпіскі штучна павялічана на 15.600 руб.

Па Савецкай Беларусі

Чырвоныя абозы з жывёлай

ЦЕРАХАЎКА, Сяляне з в. УСОХА, КРУГАВЕЦ І ЧЫРВОЧЫ КАСТРЫЧНІК (Церахаўскі раён) арганізавалі 3 чырвоныя абозы з жывёлай. Усяго беднякі і сераднякі гэтых вёсак здалі дзяржаве 104 штукі жывёлы.

І. Ш.

Крушэньне цягніка

ЖЛОБІН. 25 лістапада, у 4 гадз. ночы, на вучастку Магілеў—Жлобін на перагоне Рагачоў — 18 разьезд пацярпеў крушэньне таварны цягнік № 859. Цягнік быў пушчаны з парушэньнямі правіл тэхнічнай эксплёатацыі. У выніку крушэньня тры вагоны разьбіты ўшчэнт, чатыр вагоны вышлі з рэек. Папсаваны часткова паравоз № 6739. Цяжка паранен кандуктар т. **Сьнічараў,** які ў момант крушэньня спаў на тормазе.

Трэба адзначыць, што па Жлобінскім вузьле з-за нядбайных адносін да сваіх абавязкаў з боку паасобных служачых чыгункі выпадкі крушэньня за апошні час пачасьціліся.

У. М.

Вылазка шавіністага

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). На швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» мела месца наглая вылазка клясавага ворага пад маскай яўрэйскага шавінізму. Рабочы-яўрэй 2-га піджачнага цэху Шур накінуўся з лаянкай і ўдарыў шпулькай па галаве работніцу-беларуску т. **Піваварскую.**

Рабочая грамадзкасьць глыбока абурана гэтым выпадкам і патрабуе суровага пакаранья шавіністага Шура.

Цэхавы камітэт кваліфікаваў учынак Шура як вылазку клясавага ворага пад маскай яўрэйскага шавінізму. Шур зьняты з работы. Справа перадана ў пракуратуру.

Злачынная безгаспадарчасьць

ПАСТАЛЫ (Мазырччына). Яшчэ ўлет ку рабочыя пільні «Праца» разам з пінэрамі і вучнямі школы арганізавалі нядзельнік па зборы ўцілю. Было сабрана і вывезена для нагрузкі на пасталаўскую чыгуначную ветку больш аднаго вагону рознага ўцілю.

Ня гледзячы на тое, што з таго часу прайшло ўжо каля паўгода, уціль яшчэ не нагружан. Палову яго расьцягнулі. Рабочыя пільні абураны гэтым фактам і патрабуюць прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

М. Сінькевіч.

„Белплодагародніна" гніе з галавы

Самастрахоўка і агідны бюракратызм

ЦКК паставіла пытаньне аб зьняцьці з работы дырэктара „Белплодагародніны"

«Зьвязда» ня раз сыгналізавала аб прарывах у рабоце «Белплодагароднины», аб нядбольнасьці кіраўнікоў мабілізаваць апарат на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, аб няўменьні наладзіць загатоўкі і адгрузку гародніны і, нарэшце, аб тым, што «Белплодагароднина» гніе з галавы.

Апошні ліст дырэктара «Белплодагароднины» тав. **ГЭЙНЭ** кіраўніку свайго Бабруйскага пункту (адбітак РСІ і ДПУ) служыць яскравай ілюстрацыяй гэтага.

Тав. Гэйнэ прапануе Бабруйскаму пункту загатовіць і адгрузіць у 3-хдзённы тэрмін 25 тон морквы для Балагоўскага рабочага каапэратыву.

Каб забясьпечыць сябе ад прарываў, уникнуць адказнасьці за зрыў заданьня, каб самазастрахавацца, кіраўнік «Белплодагароднины» з самай сур'ёзнай мінай прапануе органам ДПУ і РСІ прасачыць за выкананьнем дырэктывы.

Бачыце, Бабруйск не адгрузіць морквы, вінаваты ДПУ і РСІ, яны ня выканалі даручэньня «Белплодагароднины».

А «Белплодагароднина»? Яна кіруе... Яна паслала ліст, з яе адказнасьць зьнімаецца...

У канцы ліста фігуруюць грозныя словы: «За зрыў заданьня справа перадана пракурору».

Справа каго? ДПУ? РСІ? Ці самой «Белплодагароднины»?

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б заслухаў інфармацыю аб лісьце «Белплодагароднины», кваліфікаваў яго, як надзвычай бюракратычны дакумант, як яскравы прыклад самастрахоўкі і недапушчальных адносін да органаў ДПУ і ЦКК-НК РСІ.

Улічваючы рад буйных прарываў у рабоце «Белплодагароднины», ЦКК паставіла пытаньне аб зьняцьці з работы дырэктара ўстановы—тав. Гэйнэ.

Кіраўніцтву «Белплодагароднины» даручана ўскласьці адміністрацыйнае спагнаньне на работніка Пятніцкага, які прымаў удзел у складаньні і падпісаў вышэйпаказаную бюракратычную адносіну.

Б.

Перавыбары органаў ІТС

Нарада старшынь райпрафсаветаў і ФЗМК—узьвышэйшы пленум ЦСПСБ канстатавала, што перавыбарчая кампанія вісавых органаў ІТС праходзіць на зьнічайна марудна, без удзелу рабочых мас, і не абярнулася ў шырокую палітычную кампанію.

Нарада пастанавіла працягнуць перавыбарчую кампанію да 5-га сьнежня, а на саюзе с.-г. рабочых—да 10-га сьнежня.

Прэзыдыуму БелМБІТ даручана камандыраваць у больш буйныя раёны БССР членаў БелМБІТ для праверкі ходу перавыбараў і дапамогі масовым арганізацыям.

Перабоі ў трамвайным руху будуць зьнішчаны

За апошні час назіраюцца частыя перабоі ў трамвайным руху з прычыны адсутнасьці току. Наш супрацоўнік зьвярнуўся на гэтым пытаньні ў транспартны трэст, дзе яму паведамілі наступнае:

— Перабоі ў трамвайным руху выклікаюцца тым, што менская электрастанцыя ня можа поўнасьцю задаволіць трамвай токам. Да 10 сьнежня на электрастанцыі будзе ўстаноўлен новы капёл, які дасьць магчымасьць зьнішчыць перабоі ў падачы току.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б 4 сьнежня ў 6 гадз. веч., у клюбе імя XIII-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (былая чыгуначная царква) склікае пашыраны раённы партыйны і камсамольскі актыў з парадкам дня: Вынікі становішча беларусізацыі і інтэрнацыянальнага выхаваньня і далейшыя задачы. На ваў і ячэек, члены бюро партыйных і камсамольскіх калектыкі прадпрыемстваў і ўстаноў—партыйцы. Адказнасьць за сваячасовую і поўнякія сакратаром ячэек атрымаць у РК.

Паведамленьні

ЦКК, ЦСПСБ, Кастрычніцкі і Фрунзаўскі райкомы КП(б)Б і райККК склікаюць сёньня, 2-XII у 6 гадз. вечара ў клюбе Карла Маркса гарадзкі зьлёт рабочых-вылучэнцаў, сумесна з сакратарамі партыйных, камсамольскіх ячэек, старшынямі фабзаўмясцкомаў, кіраўнікамі прадпрыемстваў і **ўстаноў гор. Менску. У парадку дня—аб становішчы рабочага вылучэнства і рабоце з вылучэнцамі.** Запрашаюцца рабкоры г. Менску.

Аддзел агітацыі і масавых кампаній ЦК КП(б)Б 3-га сьнежня ў 6 гадз. веч., у памяшканьні ЦК КП(б)Б (малая заля) склікае партыйную нараду па пытаньнях шэфскай работы заводаў, фабрык і ўстаноў на вёсцы. На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі Фрунзаўскага і Кастрычніцкага РК КП(б)В, ЦСПСБ, усіх ЦП саюзаў, старшыні кустоў РТСКСІ, прадстаўнікі шэфтаварыстваў, зав. «Бальшавік», «Энэргія», «Камунар», ф-кі «Кастрычнік», чыг. вузла і сакратары парт'ячэек ПКА, Дзяржплану, ЦВК. Яўка абавязкова.

7 сьнежня, пры аддзеле агітацыі і масавых кампаній ЦК КП(б)Б склікаецца **нарада загадчыкаў агітмасаддзеламі райкомаў КП(б)Б і парткалектываў.** Парадак дня: 1) Чарговыя задачы агітацыйнай работы партыі (пад вутлом канкрэтнага ажыцьцяўленьня пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і 2-га пленуму ЦК КП(б)Б). 2. Формы і мэтады агітацыі на прадпрыемствах. 3) Асноўныя формы агітацыі і масавай работы на вёсцы. 4) Бягучыя кампаніі і работа добраахвотных таварыстваў, 5) Задачы агітацыйна-масавай работы сярод працоўных жанчын у горадзе і на вёсцы. На нараду выклікаюцца загадчыкі агіт.-мас. аддзелаў наступных райкомаў Барысаўскага, Фрунзаўскага, Кастрычніцкага, Віцебскага, Гомельскага, Аршанскага, Магілеўскага, Полацкага, Мазырскага, Бабруйскага, Асьвейскага, Койданаўскага, Пятрыкоўскага, Чырвонаслабодзкага, Быхаўскага, Клімавіцкага, Чачэрскага, Гарадоцкага, Рагачоўскага, Капыльскага, Самахвалавіцкага, Слуцкага, Жлобінскага, Горацкага, Коханаўскага, Шклоўскага, Чэрвеньскага, Сеньненскага і Чашніцкага; фабрычна-заводзкія парткалектывы: запалкавай ф-кі (Рэчыца), зав. імя Ланцуцкага (Гомель), парткалектыў ст. Жлобін.

СЕНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз., пак. 19.—групавая кансультацыя для прапагандыстых Фрунз. раёну—«Аб ходзе выкананьня прамфінпляну асобнага кварталу і задачы ў галіне падрыхтоўкі сустрэчнага прамфінпляну на прадпрыемствах».

— **Культпроп Фрунз. РК КП(б)Б.** У 19 гадз., у памяшк. Дому Камасьветы—мэтад-кансультацыя па праграме ўдарнага дня партыйнай вучобы. Яўка ўсіх вылучаных прапагандыстых абавязкова.

— **БАН.** У 2 гадз. дня ў памяшк. БАН—нарада асьпірантаў БАН, БДУ і Камвузу, якія працуюць па гісторыі Захаду, Расіі, Беларусі і г. д. Яўка ўсіх асьпірантаў-гісторыкаў абавязкова.

— **ЦБ СНП** склікае мітынг навук. працаўнікоў г. Менску ў 302 аўд. (гал. корп.) па пытаньні: «нац.-дэмакратычн. контр-рэвал. у БССР». Дакл. т. **Платун.**

— **Групком 10 працасьветы.** У 18 гадз у памяшк. групкому (Энгельса, 8)—агульны сход настаўнікаў вяч. школ, членаў 10 групкому саюзу працасьветы.

ЗАЎТРА:

— **Фрунз. РК КП(б)Б** прапануе зьявіцца ў 18 гадз. у памяшк. РК (заля пасяджэньняў наступным т. т.: Юдзін (ЦП камунальн.), Каткоў (ЦП СГС), Драбінскі (ЦП мэтал.), Сьцепанюк (НКА), Вітлін (ВДВ), Цудзін (рэд. «Зьвязда»), Чарнецкі (Лесбел), Шадкін (ЦСПСБ), Рычкоў (ЦП працасьв.), Мікуліч (ЦВК), Палякоў (Белдзяржспаб), Верба (ЦКК), Постнікаў (НКГ), Крузмат (гарсавет), Бэнгіна (БДВ), Розман (ЦП друк), Злотнікаў (ЦП нархарч), Альтман (ЦП харч.).

— **Арг.-інструкт. аддз. ЦК ЛКСМБ** у 18 гадз. у габ. сакратара ЦК ЛКСМБ склікае нараду ўсіх прадстаўнікоў ЦК, якія выяжджалі на правядзеньні райканфэрэнцый ЛКСМБ.

— **ЦСПСБ.** У 11 гадз. ран., у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх) — ...трокая нарада бібліятэкараў прафсаюзных, палітасьветных, навуковых і вайсковых бібліятэк.

— **Т-ва пэдагогаў-маркасыстых.** У 19 гадз. у нам. нав. дасьл. ін-ту пэдагогікі—сход т-ва пэдагогаў-марксыстых.

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** паведамляе, што 2-га сьнежня ў 7 гадз. веч. у памяшканьні прыёмнай ЦВК (пляц Волі, д. № 7) склікаецца куставы дэлегацкі сход наступных прадпрыемстваў і ўстаноў: зав. «Камунар», Эльвод, Абкамтрэст, п.-к. «Уціль», ф-ка рымароў, НКЗем, НКА, працасьветы, Белдортранс, Белдзяржстрах, Лесбел, гарсавет, гарКСГУ, 1-я больніца, 15 ЖАКТ, 5-ы ЖАКТ. Яўка ўсіх дэлегатак новага складу абавязкова. Ячэйкам неабходна прасачыць за сваячасовым паведамленьнем.

— **Фрунзаўскі РК КП(б)Б** паведамляе, што 4 сьнежня ў 7 гадз. веч у памяшк. клюбу харчавікоў (малая заля) склікаецца куставы дэл. сход наступных прадпрыемстваў і ўстаноў: зав. «ДА», «Беларусь», «Пралетары». БелВуд, Белжылсаюз, Каапрадпрыемствы, харчавікоў, НКГандлю, ВСНГБ, міліцыя, хлебазавод, Белснаб, мэталяўстановы, Акадэмія Навук, 2-я больніца, саюз будаўнікоў, групком жыл. каапэрацыі, бісквітнае аддз. ф-кі «Камунарка». Яўка ўсіх дэлегатак новага складу абавязкова.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	6-19	Галоўная кантора	7-81
Партсэктар	13-80	Аддзел падпіскі	7-81
Сэктар інфармацыі	13-80	„ абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дармовым дадаткам „Прафух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. васьля тэксту 50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.
Падпісна і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пасяджэньне штабу па правядзеньні агляду ...ату сувязі БССР

адбудзецца ў сераду, 3 сьнежня, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ред. газ. «Савецкая Беларусь».

На пасяджэньне павінны зьявіцца вылучаныя ... Зайсберг (НК РСІ), Жалезьнякоў (ЦП сувязі), Сяргееў (Бел. Кіраўн. Сувязі), Сухавага (Фрунз. РК КП(б)Б), Эпштэйн (Кастрычн. РК КП(б)Б), Бройда (рэдакц. «Рабочай»), Пархімчык (рэдакцыя «Зьвязда»), Дзяніса́ў (рэд. «Чырв. Зьмена»), і прадстаўнік рэдакцыі «Акцябр». Запрашаецца т. Канакоцін.

ШТАБ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
АЎТОРАК, 2 СЬНЕЖНЯ.
Паказ для саюзу харчавікоў
У. КІРШОН „Горад вятроў"
п'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.
Постаноўка С. Розанава і М. Міцкевіча. Мастак Ю. Гольц. Музыка Старакадомскага. Дырыжэр І. Гітгарц. Хормайстэр М. Каўфман. Дырыж оркестрабарант Кунін.
ПАНЯДЗІЛАК у 8 гадз. веч.

1-шае ў БССР гукавае кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
2-я гукавая праграма „Алімпіяда мастацтваў" Гукавы кіно-агляд у 4 частках „ПОШТА" пад'шарэ у 2-х частках. Каса—ад 4 гадз. увеч. Пачатак сэансаў—6, 7 з пал., 9, 10 з пал. гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
З прычыны вялікага посьпеху другі тыдзень НЯНАВІСЬЦЬ
Эпапэя ў 8-мі актах
Пачатак дзен. сэансаў а 1 гадз. 12-ой 30 м., вечарніх- а 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Гістарычны фільм
ПАЛОНЬНІК КУКАЗУ (К. Ю. Лермантаў)
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса—ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Сідэ Чаплін у замежным фільме МАЛПАВА ВІДОВІШЧА
Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. Каса—ад 4 з пал. гадз. веч.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Гістарычны фільм Тарас Шаўчэнка ў 2-х сэрыях.
Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз. дня Каса—ад 11 гадз. 30 м.

КІНО „ПАРТАК"
2-я агошняя сэрыя НІБЭЛУНГІ (Помста Крымгільды).
Трагедыя ў 10 част.
Пачатак сэансаў: 6 г. 30 м., 8 г. 30 м., 10 г. 30 м.
Каса адчынена з 4 г. 30 м. дня

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
абвяшчае, што па загаду Наркамшляхтэла
УСТАНОЎЛЕНА ПЕРАСЫЛКА
па пошце пасылак
РАЗАМ З БЛЯНКАМІ АДРАСОЎ,
дзеля чаго на кожнай пасылцы адправіцелямі павінны нашывацца або набіваецца кішэні з бляванкамі для укладаньня туды бляванкаў адрасоў. Да пасылак у папяровай упакоўцы бляванкі адрасоў падкладваюцца пад моцную перавязку са шпагату.

ПАТРЭБНЫ
рыбаводы і гідратэхнік
па арганізацыі рыба-гадовых гаспадарак.
УМОВЫ ПЛАТЫ ПА ЗГОДЗЕ.
Зварачацца ў сэктар кадраў Белкаапсаюзу.

З ЧАЦЬВЯРГА, 4-га СЬНЕЖНЯ 1930 г.
у кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" (Савецк., 90)
ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА
1. Новы мастацкі нямы фільм „СОННАЯ КРАСУНЯ" кіно-п'еса ў 5-ці частках.
2. Гукавы фільм КАНЦЭРТ вядомых артыстых: БАРОЎСКАЙ (колёрат-сопрано) і ЧАРАВА (тэнар).

ЗОА-ВЫСТАВУКА ЗЬВЯРЫНЕЦ
ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, рог Ленінскай
адкрыта штодзенна з 8 г. ран. да 11 г. увеч.
ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:
леў, леапард, гіена паласатая, гіена плямістая, ваўкі, мядзьведзі, рысь, мураўеды, дзікабразы, барсукі, алень, вярбаюд, арлы, крападзіл, 20 малп і шмат іншае зьвярыны.
Школам і экскурсіям—ільготная плата, скідка 40 проц.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

МЦРК
даводзіць да ведама калектываў, што
ВЫДАЧА ТАЛЁНАЎ
пакярэдняй падпіскі ЗА СЬНЕЖАНЬ
будзе праводзіцца ў наступным парадку:
2 і 3-XII—калектывам саюзу будаўнікоў
4-XII » » » чыгуначнікаў
5-XII—вайсковым часьцям
6-XII—калектывам саюзу гарбароў і мэталістых
7-XII » » дрэваапрац. і тэкстыльщч.
8-XII » » транспартн. і хімікаў
9-XII » » швэйпром, паперв. і нарсувязі
10-XII » » друкароў
11-XII » » мэдсанпрацы
12-XII » » камунальн. і нархарч.
13-XII » » харчавікоў
14-XII » » саўгандальслужачых
15-XII » » працасьветы і працмастацтва
16-XII » » Рабзямлес
17-XII » » арцелей
Разьлік выдачы талёнаў праводзіцца бухгальтэрыяй (Савецкая, 43) ад 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня.
Менцэрабкоп.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 7-81

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ і дакументу 50 к.

Мсьціслаўскі Беларускі пэдагагічны тэхнікум
абвяшчае новы зімовы набор.
Заявы прымаюцца з 1-га да 20-га сьнежня 1930 г.
Пачатак заняткаў 1-га студзеня 1931 г.
На першы курс будзе прынята 90 чал.
Умовы прыёму такія-ж, як і ў іншыя тэхнікумы, згодна існуючых правіл.
55 проц. студэнтаў забясьпечваюцца стыпэндыяй.
Дырэктар тэхнікуму Панроўскі.

ДА УВАГІ ЎСІХ ГАСПАДАРЧЫХ, САВЕЦКІХ, ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФ. АРГАНІЗАЦЫЙ.
БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ
прымае заказы на газэтныя выразкі з усіх газэт часопісяў СССР і замежнай прэсы. Выразкі высылаюцца па ўсіх без выключэньня пытаньнях.
КОЖНЫ АДМІНІСТРАТАР, КОЖНЫ ГАСПАДАРНІК ПАВІНЕН УСЕБАКОВА ВЕДАЦЬ СВАЮ РАБОТУ.
ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ГАЗЭТНЫЯ ВЫРАЗКІ
ДЗЕ можна атрымаць любую даведку?
БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ
ДАЕ даведкі па ўсіх пытаньнях
вусна, пісьмова, па тэлефону і тэлеграфу.
Каб атрымаць усялякія даведкі па тэлефону,
ТРЭБА БЫЦЬ АБАНЭНТАМ «Бюро абслугоўваньня»
ВЫКЛІК па тэлефону або нумару — „Бюро абслугоўваньня сувязі"
Менск, Ленінская, 34, будынак пошты.

ЗВАРОТ да ўсіх арганізацый, якія гандлююць прадукцыяй піваварнага заводу „БЕЛАРУСЬ"
За апошні час рабочыя брыгады заводу „Беларусь" выявілі цэлы шэраг недахопаў у рэалізацыі заводзкой прадукцыі; няпоўны набор тавара крамамі, буфэтамі, сталоўкамі і г. д., ад чаго былі перабоі са здавальненьнем патрэб спажыўца і стварыліся непатрэбныя чэргі, несваячасова зварачваецца тара і г.д.
Усё гэта зрывае пляназыя заданьні заводу.
Заводакіраўніцтва зварочваецца да ўсёй кліентуры з просьбай зьнішчыць у абоегбаковых інтарэсах зазначаныя вышэй недахопы і прыняць меры да поўнага набора заводзкай прадукцыі і сваячасовому звароту тары.
Адміністрацыя зав. „БЕЛАРУСЬ".

Гомельскаму „Портострою"
ПАТРАБУЮЦЦА:

інжынэры-гідратэхнікі	2 чал.
інжынэр-мэханік	1 чал.
тэхнікі-гідратэхнікі	2 чал.
тэхнік-будаўнік	1 чал.
інжынэр-будаўнік	1 чал.

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Адрас: Кіраўніцтва «Портострой»—Гомель, вул. Арцёма, 17.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае 4 сьнежня ў 6 з пал. гадз. вечара ў памяшканьні Дому Камасьветы
СХОД СТАРЫХ РАБОЧЫХ Фрунзаўскага раёну
з наступным парадкам дня: Чарговыя палітычна - гаспадарчыя задачы партыі. (Дакладч. т. Будзінс і).
Уваход па запраўдных білетах, разасланых па парткалектывах прадпрыемстваў.

Крычаўскі РК КП(б)Б і рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»
скліканьць
у аўторак, 9 сьнежня, а 12 г. дня ў памяшканьні крычаўскага Дому Культуры
РАЁННУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ
рабселькораў і членаў рэдкалегій насьцінгазэт.
НА ПАРАДКУ ДНЯ:
Аб выданьні крычаўскай раённай газэты і задачах рабселькораў.
На канфэрэнцыю запрашаюцца ўсе члены насьцінгазэт рэдкалегій і рабселькоры Крычаўскага раёну.
Крычаўскі РК КП(б)Б, рэдакцыя газ. «ЗЬВЯЗДА»

Агульны сход пісьменьнікаў г. Менску
НАЗНАЧАЕЦЦА на 3-яе сьнежня г. г. ў Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68).
У парадку дня—даклад заг. культпропу ЦК КП(б)Б. т. ЧАРНУШЭВІЧА на тэму:
беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм
Запрашаюцца рабочыя, кампазытары, мастакі, навуковыя працаўнікі і выкладчыкі літаратуры.
Пачатак а 7-й гадзіне.
Уваход вольны.
Праўленьне Дому Пісьменьніка

Сёньня 2-XII—30 г., у клюбе нарсувязі (Ленінская, 34, дом пошты), у 7 г. веч. адбудзецца
АГУЛЬНА-ГАРАЗНАЯ НАРАДА ЯЧЭЙКАВЫХ УПАЎНАВАЖАНЫХ КП(б)Б І ЛКСМБ,
арганізатараў і абаршчыкаў падпіскі на пэрыядычны друк ад прадпрыемстваў і ўстаноў.
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Аб падпіской кампаніі на 1931 год.
2) Аб конкурсе ка лепшых ячэйкавых упаўнаважаных, арганізатораў і абаршчыкаў падпіскі на партыйны, камсамольскі і масава-рабочы друк.
Яўка ўсіх упаўнаважаных і арганізатараў абавязкова.
Фрунз. і Кастрычн. РК КП(б)Б, ЛКСМБ і культмасавы сэктар ЦСПСБ.

ПРАКУРАТУРА РЭСПУБЛІКІ 4-га сьнежня ў 7 гадз. вечара склікае
НАРАДУ ЎСІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ РЭДАКЦЫЙ,
З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
ЯК ПРАКУРАТУРА ПАВІННА РЭАГАВАЦЬ НА ГАЗЭТНЫЯ ЗАМЕТКІ.
На нараду запрашаюцца прадстаўнікі ад рэдакцый і рабкоры з кожнай з наступных газэт: «Зьвязда», «Рабочай», «Савецкая Беларусь», «Акцябр», «Орка», «Чырвоная Зьмена», «Беларуская Вёска» і прадстаўнікі рэдкалегій заводзкіх газэт, а таксама прадстаўнік НК РСІ.

КУЛЬТПР П ЦК КП(б)Б
даводзіць да ведама ўсіх літаратараў камуністых, што нарада з дакладам аб „КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ"
ПЕРАНОСІЦЦА НА 4-га СЬНЕЖНЯ.

Менск, друкарня «Зьвязды».
Менск. Галоўлітбел 337-1